Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 290 (5123)
СНЕЖНЯ
27
ЧАЦВЕР
1934 г.
год выдання XVI

МОСКВА
ЦК ВКП(б) Сельхозотдел комната 639
Иосифову
на 1934 г.
Звезда—1

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

У сувязі з тым, што МАСКОЎСКАЯ вобласць, ТАТАРСКАЯ АССР, ГОРКАЎСКІ край, БАШКІРСКАЯ АССР, ЗАХОДНЯЯ вобласць, ІВАНАЎСКАЯ вобласць, УСХОДНЕ-СІБІРСКІ край, ЧЭРНІГАЎСКАЯ вобласць, КІЕЎСКАЯ вобласць, МАЛДАЎСКАЯ АССР, БЕЛАРУСКАЯ ССР І АРМЯНСКАЯ ССР выканалі ўстаноўлены для іх СНК СССР і ЦК ВКП(б) гадавы план хлебаздачы і поўнасцю забяспечылі сябе насеннем для яравой сяўбы, — Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

Дазволіць калгасам, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам памянёных рэспублік, краёў і абласцей рабіць бесперашкодна продаж свайго хлеба (мукой, зярном, печаным хлебам) як дзяржаўным і кааператыўным арганізацыям, так і на гарадскіх і сельскіх рынках і на станцыях чыгунак.

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР М. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) І. СТАЛІН.

26 снежня 1934 года

АБ ГНІЛЫМ ЛІБЕРАЛІЗМЕ ДНЕПРАПЕТРОЎСКАГА ГАРКОМА І АБ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ПІЛЬНАСЦІ

На працягу апошняга часу нам прыйшлося аддаваць вялікую ўвагу кіраўніцтву днепрапетроўскага гаркома. Гутарка ішла аб трацкістах і нацыянал-ухілістах, якія акопаліся ў Днепрапетроўскім дзяржаўным універсітэце, і аб антыпартыйных паводзінах кіраўнікоў гаркома. Гутарка ішла таксама аб хісткай, памылковай пазіцыі ў гэтай справе абласнога камітэта партыі. Патрабавалася ўмяшанне Цэнтральнага Камітэта КП(б) Украіны, каб прасачыць партыя большэвікоў паводзіны кіраўнікоў гаркома, у асаблівасці яго зарваўшагося сакратара—Левіціна, а таксама спыніць качку Днепрапетроўскага абласнога камітэта партыі.

У сваёй пастанове ад 22 снежня Цэнтральны Камітэт КП(б)У канстатаваў, што «бюро днепрапетроўскага гаркома КП(б)У, і ў асаблівасці сакратар гаркома Левіцін, не гледзячы на шматразовыя, зусім правільныя і пацвердзіўшыяся поўнасцю сігналы «Праўды» аб засмечанасці Днепрапетроўскага універсітэта нацыяналістычнымі і трацкісцкімі элементамі,—не толькі не прынялі неабходных мер па выкрыццю і разгрому іх, але далейшымі сваімі паводзінамі стала на шлях адкрытай абароны гэтых элементаў». Пазіцыя абкома ахарактарызавана, як няправільная, па сутнасці змазваючая грубейшыя палітычныя памылкі і гнілы лібералізм кіраўніцтва гаркома і яго сакратара Левіціна.

Пазіцыя абкома рашуча асуджана, а кіраўніцтва гаркома (ЛЕВІЦІН, СКРЫПНІК, ГЕХТМАН) знята з работы. Знят з работы і загадчык культпропа абкома СЕГАЛОВІЧ, не прыняўшы неабходных мер супроць засмечанасці ўніверсітэта нацыяналістычнымі і трацкісцкімі элементамі і праявіўшы да іх гнілы лібералізм.

Рэзкага асуджэння заслугоўваюць днепрапетроўскія газеты. Рэдактар «Зоры» НІКІТАЎ, усяляк падтрымліваючы збанкрутаваных кіраўнікоў гаркома, уводзіў у зман партыйныя масы. Не па-большэвіцку сёў сябе і рэдактар «Ударника транспорта» ЧЭПУРНЯК, які нават пасля рашэння ЦК КП(б)У працяўжаў адстойваць гнілую, прымірэнчую лінію гаркома.

ПАМЫЛКІ ДНЕПРАПЕТРОЎСКІХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НАСТОЛЬКІ ЗНАЧНЫЯ, НАСТОЛЬКІ ПАВУЧАЛЬНЫЯ, ШТО З ІХ ЗРОБЯЦЬ НЕАБХОДНЫЯ ВЫВАДЫ ЎСЕ ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ.

Яшчэ і яшчэ раз пацвярджаецца абсалютная правільнасць указанняў таварыша СТАЛІНА, даных ім у дакладзе на XVII з'ездзе партыі, аб неабходнасці сістэматычнага выкрыцця чужой, варожай ленінізму ідэалогіі. Ворагі партыі, усякага роду апартуністы і нацыянал-ухілісты разбіты ўшчэнт. Але астаткі іх яшчэ існуюць. Разгромленыя ў адкрытай барацьбе, не маючы н'якага падтрымання ў масах, асколкі былых антыпартыйных груп вышукваюць новыя метады, новыя спосабы барацьбы супроць партыі і совецкай улады. У імя дасягнення сваіх мэт контрэвалюцыянеры трацкісты, нацыянал-ухілісты і апартуністы ўсіх масцей заключаюць узаемныя кемпрамісы, блакуюцца. Жадаючы ўйсці ад партыйнага вока, ад узрокаў мас, яны акопваюцца на непрыкметных участках соцыялістычнага будаўніцтва, дзвурушнічаюць і вядуць падрыўную работу. Так было, у прыватнасці, і ў Днепрапетроўскім дзяржаўным універсітэце.

Галоўная стаўка робіцца на моладзь. Іменна таму зараз усё часцей сустракаюцца факты трацкісцкіх і буржуазна-нацыяналістычных выступленняў у ВНУ і ВТНУ. Патрэбна ВЫКЛЮЧНАЯ ПІЛЬНАСЦЬ, каб СВОЕЧАСОВА ўскрываць і прасякаць подлую работу класавага ворага.

Многія партыйныя арганізацыі не лічацца з новай тактыкай варожых пролетарыяту элементаў. Наглядным прыкладам можа служыць тойжа днепрапетроўскі гарком, які настолькі прытупіў сваю пільнасць да ворагаў, што па сутнасці аказаўся ў палоне ў мізэрнай кучкі збанкрутаваўшыхся паміж сабой трацкістаў і буржуазных нацыяналістаў.

На жаль, днепрапетроўскі гарком не адзінокі. У лістападзе мы пісалі аб трацкісцкіх выпазках выкладчыка КУРСКАЙ вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы ЛАДЫЖЭНСКАГА. Толькі пазаўчора мы паведамлялі аб трацкісцкіх пекцыях выкладчыка РАСТОЎСКАЙ вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы ВЛАДЗІМІРАВА. У абодвух выпадках характэрным з'яўляецца тое, што мясцовыя партыйныя арганізацыі не толькі своечасова не адзярнулі контрэвалюцыйных «агітпропаў», але доўгі час аставаліся глухімі к сігналам студэнтаў.

Вораг не склаў сваёй зброі. Здраднікі стрэл у таварыша Кірава—сігнал супроць бестурботнасці і благадушнасці. Чым пераможней будаўніцтва соцыялізма, чым больш звужаецца база для падрыву совецкага ладу, чым безнадзейней становішча класавых ворагаў і іх агентуры, тым авантурыстычней іх метады барацьбы з партыяй і совецкай уладай. Яны скарыстаюць у сваіх мэтах малейшыя нашы недахопы і промахі, запішнюю адкрытасць і бапбатлівасць гора-комуністаў, якія, падобна дурню, небяспечней ворага.

І ўдзячная глеба для шкодніцкай работы ствараецца ў першую чаргу там, дзе партыйныя арганізацыі, комуністы, комсамольцы хоць у якой-небудзь меры, хоць на адну секунду трацяць, або прытупляюць сваю пільнасць, сваё ўменне распазнаваць і выкрываць трацкістаў, зіноўеўцаў, правых апартуністаў, буржуазных нацыяналістаў.

«Трэба мець на ўвазе,—гаварыў таварыш СТАЛІН,—што рост магутнасці совецкай дзяржавы будзе ўзмацняць супраціўленне апошніх астаткаў паміраючых класаў... На гэтай глебе могуць ажыць і заварушыцца разбітыя групы старых контрэвалюцыйных партый эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў цэнтра і акраін, могуць ажыць і заварушыцца асколкі контрэвалюцыйных апазіцыйных элементаў з трацкістаў і правых ухілістаў. Гэта, зразумела, не страшна. Але ўсё гэта трэбо мець на ўвазе, калі мы хочам пакончыць з гэтымі элементамі быстра і без асаблівыхахвяр.

Вось чаму рэвалюцыйная пільнасць з'яўляецца той самай якасцю, якая асабліва неабходна цяпер больш шэрагам».

Партыя Леніна—Сталіна загартоўваецца, расце і мацнее ў жорсткіх баях з ворагамі пролетарскай рэвалюцыі, у барацьбе з апартуністамі ўсіх масцей і адценняў. Гэта барацьба пракладжвецца. ПАРТЫЯ ЧАКАЕ НЕ РЭЗАЛЮЦЫЙ І ДЭКЛАРАЦЫЙ АБ ПІЛЬНАСЦІ, А КАНКРЭТНЫХ БОЛЬШЭВІЦКІХ СПРАЎ НА ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ ШАХТАХ І РУДНІКАХ, У КАЛГАСАХ І СОЎГАСАХ ВА ЎСТАНОВАХ І ШКОЛАХ—НА ЎСІХ УЧАСТКАХ ВЯЛІКАЙ БУДОЎЛІ.

Рэвалюцыйная пільнасці на практыцы, бязлітасней непрымірымасці к ворагам, старанная падбору кадраў, высокай якасці ідэйнай работы, штодзённага выхавання партыйных і комсамольскіх мас—вось чаго мы павінны патрэбаваць ад кожнай партыйнай арганізацыі, ад кожнага партыйнага кіраўніка. (Перадавы артыкул «Праўды»).

АБ СПІСАННІ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ З КАЛГАСАЎ ПА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ ПАЗЫКАХ, ВЫДАНЫХ ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1933 Г.

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

У выкананне пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) ад 23 снежня 1934 г. аб спісанні з калгасаў запазычанасці па сельска-гаспадарчых пазыках, выданых да 1 студзеня 1933 г., у мэтах далейшага гаспадарчага ўмацавання калгасаў і аказання дзяржаўнай фінансавай дапамогі калгасам, СНК БССР і ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Абавязаць Наркамфін, Наркамзем БССР і Беларускую кантору Сельгасбанка ў пятнадцацідзённы тэрмін прадставіць на зацвярджэнне Соўнаркома БССР канкрэтныя сумы запазычанасці, належачыя да спісання па кожнаму калгасу, за якім лічыцца запазычанасць па ўзятых пазыках на 1 студзеня 1933 г. у межах агульнай сумы, падлягаючай спісанню па БССР у размеры 19.702 тыс. руб.

2. Даручыць усім райвыканкомам і райкомам, упічваючы выключна важнае значэнне пастановы СНК СССР і ЦК КП(б), аказаць усяляк-нае садзеянне органам Наркамфіна, Наркамзема і Сельгасбанка ва ўстаноўленні сумы запазычанасці, падлягаючай спісанню па кожнаму калгасу паасобку.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б Н. ГІКАЛО.

г. Менск, 26 снежня 1934 г.

ВІЦЕБСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ФІНПЛАН IV КВАРТАЛА

ЦК КП(б)Б — тав. ГІКАЛО.
СНК БССР — тав. ГАЛАДЗЕДУ.
ЦВК БССР — тав. ЧАРВЯКОВУ.
НАРКАМФІНУ—тав. ХАЦКЕВІЧУ.
РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

Уключыўшыся ў фінансавы паход імя XI з'езда совецкаў Беларусі і ўпарта ведучы барацьбу за права рапарту т. Молатаву, Віцебскі раён выканаў фінплан IV квартала 1934 г. 25 снежня на 101 проц.

Прадаўжаем далейшую мабілізацыю сродкаў, дабіваючыся выканання фінплана кожным прадпрыемствам і сельсоветам.

Сакратар ГК КП(б)Б ЖУРАЎЛЕЎ.
Старшыня горсовета АВЕРЬІН.
Загадчык гарфа СТРЫГО.

Вынікі лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б)

Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на актыве Маскоўскай гарадской партыйнай арганізацыі з удзелам членаў абкома і гаркома ВКП(б) 15 снежня 1934 г.



Таварышы! З паведамленняў у газетах вы ўжо ведаеце, што лістападаўскі пленум ЦК нашай партыі абмеркаваў пытанні—аб адмене картачнай сістэмы па хлебу і некаторых іншых прадуктах, аб палітаддзелах у сельскай гаспадарцы і затым, у парадку бягучых спраў, рад важнейшых пытанняў сельскай гаспадаркі: аб развіцці жывёлагадоўлі, прыкладным статуце сельскагаспадарчай артэлі, фінансавым становішчы і запазычанасці калгасаў, аб індывідуальнай сялянскай гаспадарцы, адстałых калгасах, аб камбайнах і камбайнерах.

Першыя два галоўныя пытанні—аб адмене картачнай сістэмы і аб пераўтварэнні палітаддзелаў з'яўляюцца генеральнай праграмай далейшай работы нашай партыі ў горадзе і ў сельскай гаспадарцы. Абодва гэтыя пытанні, у асаблівасці ў сувязі з абмеркаванымі пленумам бягучымі справамі, падводзяць вынік буйнейшай гістарычнай паласе,—па картачнай сістэме за 6 год і палітаддзелах за два гады. Яны з'яўляюцца яркім паказальнікам гіганцкага росту магутнасці нашай дзяржавы, намячаюць вялікія перспектывы і задачы, як арганізацыйна-гаспадарчыя, так і палітычныя.

Значэнне адмены картачнай сістэмы

Картачная сістэма была ўведзена ва ўмовах, калі наша партыя пачала ажыццяўляць гіганцкі план соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны і калі сельская гаспадарка, у сваёй большасці аднаасобная (у калгасах тады было ўсяго каля 2 проц. гаспадарак), не была здольна задаволіць узрослыя патрэбнасці гарадоў і новабудоў.

У 1928 годзе калгасы і соўгасы далі каля 14 проц. загатоўленага хлеба. Усяго ў краіне было загатоўлена 650 млн. пудоў хлеба, у тым ліку 416 млн. пудоў харчовых культур. Разграбленыя сялянскія гаспадаркі рэзка адставалі ад росту нашай соцыялістычнай прамысловасці, уражайнасць іх была вельмі нізкая.

Патрабаваліся выключныя мерапрыемствы—у галіне перабудовы сельскай гаспадаркі, у сістэме і метадах хлебазагатовак, сістэме і метадах размеркавання загатоўленага хлеба—для таго, каб узрастаючая соцыялістычная індустрыя атрымала неабходную матэрыяльна-харчовую базу, без якой немыслімы ні развіццё гарадоў, ні рост прамысловасці.

Увёўшы картачную сістэму, мы ўсімі спосабамі стараліся палепшыць яе. У 1931-1932 гг. органы снабжэння працавалі дрэнна, у нас былі чарги за хлебам і за іншымі прадуктамі. Таксама дрэнна працавалі нашы сталовыя.

Каб палепшыць работу органаў снабжэння, былі арганізаваны закрытыя рабочыя кааператывы, а затым аддзелы рабочага снабжэння на прадпрыемствах. Картачную сістэму мы пастаравалі перабудовай органаў снабжэння для таго, каб у першую чаргу рабочыя былі забяспечаны нармаванымі прадуктамі.

Хлебазаводаў тады амаль не было. Толькі за апошнія 3-4 гады мы забяспечылі Маскву, Ленінград і рад іншых гарадоў хлебазаводамі і вялікімі механізаванымі пякарнямі.

Картачнай сістэмай было ахоплена каля 50 мільёнаў чалавек. Апрача таго, у раёнах тэхнічных культур часткова снабжалася хлебам у парадку атаварвання каля 24 млн. чалавек.

Калі нам удалося вызваліцца ад імпарту бавоўны і значна расшырыць пасевы ільну і іншых тэхнічных культур, дык толькі таму, што мы шляхам атаварвання змаглі забяспечыць хлебам бавоўнаробаў, ільнаводаў і іншых вытвярцаў тэхнічных культур.

Па меры росту сельскай гаспадаркі, умацавання калгаснага ладу і павелічэння колькасці загатаўляемага дзяржавай хлеба мы разгортвалі камерцыйны гандаль хлебам і іншымі таварамі, а таксама калгасны гандаль.

Увядзенне камерцыйнага гандлю ўнесла пэўную разнавоснасць у сістэму снабжэння: атрымаліся дзве сістэмы—пайковая і камерцыйная.

Камерцыйны гандаль рос з года ў год. У 1931 годзе ўдзельная вага камерцыйнага гандлю ў агульным тавараазвароце складала ўсяго 3 проц., у 1934 годзе—24 проц. Па хлебу камерцыйны гандаль складае зараз 44 проц. к нармаванаму гандлю, па цукру—25 проц., па кандытарскіх вырабах—30 проц. і па кансервах — 28 проц.

Першыя часы цэны ў камерцыйных магазінах былі высокія. З кожным годам мы зніжалі цэны на камерцыйныя тавары. На цукар цэны зменшаны ў два разы, зніжаны таксама цэны на камерцыйны хлеб і іншыя прадукты.

Калі ўлічыць, што велізарная колькасць людзей купляла хлеб і іншыя прадукты і на калгасным рынку, то стане зразумелым, што картачная сістэма закываецца не ў адміністрацыйным парадку, а пад яе адмену падведзена аканамічная база.

Не прыходзіцца даказваць, якую велізарную карысць прынесла ў свой час картачная сістэма. Зусім ясна, што без увядзення картак мы не толькі не забяспечылі б краіну тэхнічнымі культурамі, але не маглі б пракарміць гарады, заводы і фабрыкі.

Даволі ўказаць, што ў Маскве, напрыклад, у 1928 годзе было 2 млн. жыхароў. Спажывалі яны ў суткі 1100-1200 тон хлеба. У 1934 годзе ў Маскве ўжо 3.600 тысяч жыхароў і спажываюць яны ў дзень 2.750—2.800 тон хлеба. Без картачнай сістэмы мы не маглі забяспечыць хлебам бурна ўзрастаючае насельніцтва гарадоў і новабудоў.

Мы, большэвікі, заўсёды ўмеем бачыць і ўлічваць змяненне абстаноўкі. Мы вельмі добра ведалі тыя адмоўныя бакі, якія ўласцівы картачнай сістэме. Яна патрабуе грамоздкага апарата размеркавання, стварае крайнюю складанасць для самога спажыўца. Адзін рабочы аўтаавоцца імя Сталіна расказваў, напрыклад, як яму прыйшлося для атрымання хлебных талонаў збіраць 15 подпісаў і рэзалюцый, і гэта не таму, што на аўтазаводзе дрэнна арганізавана снабжэнне. Справа ў грамоздкасці самой картачнай сістэмы.

Карткі стваралі механічнае размеркаванне тавараў. Лозунг, высунуты тав. Сталіным на XVII з'ездзе партыі—ды яшчэ задоўга да з'езда—аб развіцці тавараазвароту, аб развіцці совецкага гандлю—нельга поўнасцю ажыццявіць пры захаванні картачнай сістэмы. Яна не можа не быць пэўным тормазам у развіцці тавараазвароту і совецкага гандлю. Мы бачылі гэта і ведалі раней, але цярпелі, бо плюсы картачнай сістэмы перавышалі мінусы. У даны момант мы ўжо дастаткова моцны, каб адмовіцца ад картак па хлебу і раду іншых прадуктаў.

Для адмены картак неабходны рэсурсы, неабходна дабіцца ўздыму сельскай гаспадаркі.

У гэтым годзе, не гледзячы на неўраджай у радзе раёнаў Украіны, Паўночнага Каўказа, Нізкага Волгі, мы вышлі з хлебным балансам лепш, чым за ўсе папярэднія гады.

Гэта паказвае найбольш наглядна, найбольш ярка перавагі калгасна-соўгаснай сістэмы. Калгасы і соўгасы ў гэтым годзе далі ўжо 92 проц. загатоўленага хлеба. Дзяржава мае паўтара мільярда пудоў хлеба (у два з лішнем разы больш, чым у 1928 годзе) і можа ад размеркавання хлеба па картках перайсці да шырокага продажу яго па адзіных дзяржаўных цэнах.

Вось чаму пленум ЦК прыняў на прапанове тав. Сталіна пастанову аб ліквідацыі картачнай сістэмы.

Адмена картачнай сістэмы дае нам наступныя важныя плюсы.

Разгортванне таваразвароту совецкага гандлю

Адмена картачнай сістэмы азначае, што ад механічнага, сляпога размеркавання тавараў трэба адмовіцца. У нас ёсць тавары не прэнна арганізаванай прамысловасці, павялічваюцца прадукты і сельскай гаспадаркі. Але гэтага мала—трэба ўстанавіць, сустрэчны абмен тавараў. Трэба навучыцца культурна даводзіць тавары да спажыўца.

Адмена картачнай сістэмы павінна прымусіць гандлёвыя арганізацыі ў корані перабудаваць сваю работу для палепшання абслугоўвання спажыўца. Спажывец, купляючы за ўласныя грошы тавары ў якім ён хоча магазіне, будзе прад'яўляць павышаныя патрабаванні. І гэта прымусіць гандляваць лепш, чысцей, па культурнаму, ліквідаваць непавагу, бязгушныя адносіны да спажыўца, якія праяўляліся ў радзе звенняў гандлёвай сеткі.

Толькі пасля таго, як нашы гандлёвыя арганізацыі навучацца даводзіць тавары да спажыўца; пасля таго, як яны наладзяць таваразварот; пасля таго, як мы скарыстаем таваразварот «да дна», — пасля гэтага можна паставіць пытанне аб пераходзе ад таваразвароту да прадуктаабмену.

(ПРАЦЯГ НА 2 СТАР).

НІЯКАЙ ЛІТАСЦІ ЗДРАДНІКАМ РАДЗІМЫ

ПРОЛЕТАРЫІ ВІЦЕБСКА ПАТРАБУЮЦЬ СУРОВАЙ КАРЫ ДЛЯ ПОДЛЫХ ЗАБОЙЦАЎ тов. КІРАВА І ІХ НАТХНІЦЕЛЕЙ

ВІЦЕБСК, 26 снежня. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»)

25 снежня на ўсіх фабрыках і заводах Віцебска адбыліся мітынгі ў сувязі з апублікаваннем матэрыялаў НКУС.

— Ніколі не было такой вялікай азлобленасці да ворага, як зараз. Няма меж гэтай азлобленасці да ворагаў, якія імкнуцца забіць з-за вугла нашых любімых правадыроў рабочага класа і зрабіць рэстаўрацыю капіталізма ў СССР, — гавораць рабочыя на мітынгах.

Рабочыя завода «Чырвоны металіст» імя Кірава на мітынгах горача абгаворвалі паведамленне наркамата ўнутраных спраў аб заканчэнні пашырэлага следства па справе аб забойстве Кірава. Выступаўшыя на мітынгах рабочыя патрабавалі ад органаў пролетарскага суда суровага пакарання контрэвалюцыйных падонкаў зіноўеўскіх белабандытаў.

Стары рабочы кавальнага цэха т. Сандлер, які прымаў удзел ад віцебскіх рабочых у пахаванні т. Кірава ў Маскве, падзяліўся ўражаннямі, з якой любоўю пролетарыят Ленінграда адзываецца аб сваім Міроныч. Тав. Сандлер узяў на сябе абавязак дапамагчы пэху да 1-га красавіка стаць цэхам тэхнічнай граматнасці.

Стары рабочы Страмецкі падаў заяву ў спачуваючыя.

Рабочыя фабрыкі «КІМ», якія на агульна-фабрычным мітынгу патрабавалі ад органаў пролетарскай улады суровага пакарання падонкаў не толькі непасрэднага забойцы Кірава, але і ўсіх подлых астаткаў былой антысовецкай зіноўеўскай групы, натхніцеляў гэтага забойства.

Рабочыя фабрыкі імя Клары Цэткін на цэхавых мітынгах патрабавалі самага суровага пакарання забойцы. Рабочыя фабрыкі імя Клары Цэткін узялі на сябе абавязак датэрміново выканаць промфінплан першага квартала 1935 г.

ШЗМПЕЛЬ

БЯЗЛІТАСНА ПАКАРАЦЬ ЗАБОЙЦАЎ!

ГОМЕЛЬ, 26 снежня. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»)

Трохтысячны калектыў рабочых вагонарамонтнага завода імя Ланцуцкага патрабуе жорсткай кары забойцам Сергея Міроновіча Кірава.

Беспартыйны рабочы, ударнік зборачнага цэха, член ЦВК БССР тав. Вараб'ёў сказаў:

—Стрэлам подлага агента зіноўеўскай апазіцыі забіт тав. Кіраў, стойкі барацьбіт за генеральную лінію партыі. Яны сталі на шлях тэрарыстычных актаў супроць лепшых сыноў партыі і рабочага класа. Але няма той сілы, якая-б магла расстроіць нашы рады. Шлем здраднікам нашай соцыялістычнай радзімы праклянцце. Яны вырвалі з нашых радоў Міроныча. Страта вельмі цяжкая, але нашы рады не садрагнуліся. Мы прадоўжым яго справу. У адказ на іх вылазку мы пачыльней згуртуемся вакол ВКП(б) і лепшыя з нас уступяць у рады спачуваючых ВКП(б). Мы яшчэ мацней будзем змагацца за выкананне вытворчых планаў. Наш зборачны цэх закончыць гадавы план 28 снежня.

Рабочы Хамячун сказаў:

— Таварыша Кірава я ведаю асабіста з франтоў грамадзянскай вайны. Ён быў стойкі большэвік і адданы таварыш. Толькі абнаглеўшая шайка разлюшыўшыхся элементаў пасмела стрэліць з-за вугла, адняць у нас дарагога Міроныча. Мы ўсе як адзін патрабуем ад урада бязлітаснай кары забойцам.

Рабочыя рашылі адказаць на забойства Кірава перавыкананнем промфінплана.

АБ НАСЕННАЙ ДАПАМОЗЕ КАЛГАСАМ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

У мэтах далейшага гаспадарчага ўмацавання калгасаў Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Адпусціць з дзяржаўных запасаў калгасам, пацярпеўшым ад стыхійных няшчасцяў, насенную, харчовую і фуражную пазыку ў памерах 69.197 тысяч пудоў.

2. Размеркаваць адпускаемую калгасам насенную, харчовую і фуражную пазыку па раёнах наступным чынам:

Калгасам УКРАІНСКАЙ ССР — 38.550 тысяч пудоў, у тым ліку:
Днепра-Петроўскай вобласці — 12.200 тысяч пудоў,
Одэскай вобласці 10.900 тысяч пудоў,
Данецкай вобласці — 6.400 тысяч пудоў,
Харкаўскай вобласці — 5.450 тысяч пудоў
Вінніцкай вобласці — 2.450 тысяч пудоў
Кіеўскай вобласці — 950 тысяч пудоў,
Чэрнігаўскай вобласці — 200 тысяч пудоў.
Калгасам Азова-Чорнаморскага края — 4 мільёны пудоў,
Калгасам Паўночна-Каўказскага края — 1.100 тысяч пудоў,
Калгасам Сталінградскага края — 7 млн. пудоў,
Калгасам Саратаўскага края — 7 млн. пудоў,
Сярэдне-Волжскага края — 5 млн. пудоў,
Калгасам Варонежскай вобласці — 1.370 тысяч пудоў,
Калгасам Заходне-Сібірскага края — 5 млн. пудоў,
Калгасам Таджыкскай ССР — 177 тысяч пудоў.

3. Насенную, харчовую і фуражную пазыку адпусціць бяспроцантна з абавязковым зваротам натурэю ўвосень 1935 года, прычым адміністратыўныя і транспартныя расходы дзяржавы налічаць пры звароце пазык у размеры 10 пудоў на кожныя 100 пудоў адпушчанай пазыкі.

4. Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) звяртаюць увагу ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый і калгасаў на тое, што збор і вычыстка насення павінна быць закончана паўсямесна ў найкарацейшы тэрмін з тым, каб своечасовай падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі забяспечыць ранняе скончанне сяўбы і тым самым дабіцца больш высокага ўраджаю.

Старшыня Совета Народных Камісараў СССР — В. МОЛАТАЎ
Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) — І. Сталін.

26 снежня 1934 года.

V ПЛЕНУМ ВЦСПС

Пяты пленум ВЦСПС склікаецца 29 снежня 1934 года з наступным парадкам дня:

1. Аб правядзенні ў жыццё рашэнняў ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб адмене картачнай сістэмы, а таксама аб перазаключэнні калдагавораў.

2. Даклады ПК саюзаў рабочых каменнавугольнай прамысловасці ўсхода і рабочых цяжкага машынабудаўніцтва аб культурна-бытавым абслугоўванні рабочых на прыкладзе прадпрыемстваў Уралмаша, шахт Емельянаўскай і імя Карла Маркса (Ленінскі рудні, Кузбас).

3. Кантрольныя лічбы бюджэта профсаюзаў на 1935 год.

ПРЭЗІДЫУМ ВЦСПС

Вынікі лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б)

Працяг даклада тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на актыве Маскоўскай гарадской партыйнай арганізацыі з удзелам членаў абкома і гаркома ВКП(б) 15 снежня 1934 г.

Адмена картачнай сістэмы ставіць на рэальную, матэрыяльную базу палітыку зніжэння цэн. Пайковы хлеб, не гледзячы на тое, што па колькасці ён займаў вялікае месца, на рынкавыя цэны ўплыву амаль не меў, бо ён прававаўся ў замкнутай сістэме. Картачная сістэма пазбаўляла нас велізарнага рычага ўплыву на рынкавыя цэны. Да гэтага часу мы наглі ўдзейнічаць на рынак галоўным чынам камерцыйным гандлем. Зараз, з адменай картак, дзяржава атрымлівае магутны сродак уздзеяння на зніжэнне рынкавых цэн. Кожны рабочы і працоўны ў найкарацейшы тэрмін пераканаецца ў тым, што рынкавыя цэны на хлеб знізяцца. А гэта ў сваю чаргу прыведзе да зніжэння цэн на ўсе іншыя прадукты. Ужо адно апублікаванне паведамлення аб адмене картачнай сістэмы з 1-га студзеня аказала ўплыў на зніжэнне рынкавых цэн. Зніжэнне цэн для нас важна таксама і з пункту гледжання далейшага развіцця, пад'ёму жывёлагадоўлі.

Нарэшце, значэнне рэформы заключаецца ў тым, што яна падсякае магчымасць спекуляцыі хлебам. Няма чаго таіць, што зараз многія, атрымліваючы хлеб па тэнай пайковай цане, перапрадаюць яго на рынку малочніцам і інш.

Розныя цэны на хлеб дапамагаюць развіццю дробнай спекуляцыі. Адмена картачнай сістэмы і ўстанаўленне адзіных паясных цэн на хлеб запрушае спекуляцыю.

Совецкі рубель безумоўна ўмацуецца. Палітыка павышэння кошту нашага рубля, якую праводзіць партыя і ўрад, сустракала перашкоду, выцякаючую з картачнай сістэмы. Ліквідацыя картак, развіццё тавараабароту і гандлю вядзе да рашучага і хуткага ўмацавання кошту нашага рубля, а, значыць, і да павышэння рэальнай заработнай платы.

У грашовых адносінах дзяржава ад гэтай рэформы не толькі не атрымае прыбытку, а, наадварот, можна напэўна сказаць, што дзяржава атрымае грашовыя страты. Затое агульны эканамічны вынік будзе безумоўна выйгрышным для ўсяго гаспадарчага жыцця краіны і для шырокіх працоўных мас.

Працоўныя нашай краіны правільна разумеюць рашэнне Цэнтральнага Камітэта партыі і ўрада. На праходзячых выбарах у советы рабочых, служачых, калгас нікі аднастайна адабраюць адмену картачнай сістэмы, бачачы ў гэтым заруку новага магутнага росквіту сацыялістычнай гаспадаркі, рост багацця краіны і добрабыту ўсіх працоўных **(бурныя апладысменты).**

Практычныя мерапрыемствы ліквідацыі картачнай сістэмы

З адменай картак хлебныя цэны ўстаноўлены на сярэднім узроўні паміж пайковымі і камерцыйнымі. Рабочая дзяржава праяўляе сябе тут ярчэй за ўсё як рабочая дзяржава тым, што павялічвае адначасова заработную плату рабочым і служачым звыш чым на 4 мільярды рублёў, павялічвае загатоўчыя цэны на тэхнічныя культуры і павышае загатоўчыя цэны на 10 проц. па зернапастаўках і 20 проц. па хлебазакупках у сялян.

Заработная плата рабочых за апошнія гады нязменна расла. Возьмем, напрыклад, тэкстыльшчыкаў. Я прыводзіў ужо на сустрэчах-выбарчым сходзе рабочых Трохгорнай мануфактуры даныя аб заработку рабочых Трохгоркі па асобных прафесіях.

Гэтыя лічбы вельмі паказальныя. Вось яны: банкаброшніца зарабляла ў месяц у 1931 г. 60 руб., зараз—138 руб. Ватэрщыца па аснове зарабляла ў месяц у 1931 годзе 87 руб., зараз—153 руб. Ватэрщыца на ўтку зарабляла ў месяц у 1931 г. 95 руб., зараз — 195 руб. Маталка зарабляла ў месяц у 1931 г. 75 руб., зараз — 170 руб. Шліфавальшчыца на трох машынах зарабляла ў месяц у 1931 г. 140 руб., а зараз — 264 руб. Ткач на чатырох варштатах зарабляў у месяц у 1931 г. 90 руб., зараз — 163 руб. Ткач на шасці варштатах зарабляў у месяц у 1931 г. 90 руб., а зараз —222 руб. Падмайстар зарабляў у месяц у 1931 г. 197 руб., зараз—377 руб.

Як бачыце, таварышы, на прыкладзе Трохгоркі тэкстыльныя прадпрыемствы арабілі за тры гады вялікі скачок наперад. Тое самае і на іншых прадпрыемствах.

Зараз з студзеня 1935 г. праводзіцца новае павышэнне заработнай платы. Правядзімае павышэнне заработнай платы кампенсуе пераважную частку розніцы, якую рабочы і служачы павінны плаціць у сувязі з новымі цэнамі на хлеб, крупы і грамадскае харчаванне. Аднолькава снабжаўшыеся рабочыя аднаго прадпрыемства ўсе атрымаюць аднолькавую прыбаўку, якая будзе ўключана ў тарыфную стаўку. Для Масквы гэта прыбаўка складае прыкладна да 20-25 руб. у месяц.

Розніца паміж ранейшымі і новымі размерамі заработнай платы, стыпендыі і пенсій не будзе абкладацца падаткамі, зборамі, з яе не будзе брацца кватэрная плата, павышэнні ўзносы ў кааператывы і т. п.

Мы, вядома, не можам устанаўліваць заработную плату па ядоцкаму прынцыпу. Заработная плата ўстанаўляецца ў залежнасці ад кваліфікацыі і прадукцыйнасці працы (ад якасці і колькасці затрачанай працы).

Правядзячы павышэнне заработнай платы старшыні фабкомаў, дырэктары прадпрыемстваў, сакратары партыйных камітэтаў павінны **канкрэтна** падыходзіць да кожнага цэха, прафесіі, нават да асобнага рабочага, вывучыць іх месца на вытворчасці, кваліфікацыю, нормы выпрацоўкі, прадукцыйнасць. Цяпер рэзка павышаецца значэнне заработнай платы як асноўнага рэгулятара аплаты працы рабочых і служачых.

Адкрыты продаж хлеба і іншых прадуктаў будзе спрыяць уздыму прадукцыйнасці працы. Кошт совецкага рубля падымаецца. Лепш працуючы людзі змогуць больш зарабіць. На грошы яны змогуць вольна купіць усе неабходныя ім прадукты. Некаторае павышэнне цэн на грамадскае харчаванне цры дзецца зрабіць, каб яно было невялікім, неабходна максімальна скараціць адміністрацыйныя выдаткі, не дапускаць псавання прадуктаў, змагацца з раскраданнямі.

Нядаўна мне прышлося быць на варштатазаводзе імя Орджанікідзе. Заходжу ў сталовую. Аказваецца, тут цэны на абеды штодзень мяняюцца. Учора абед каштаваў 70 кап., сёння — 90 кап., заўтра — зноў 70 кап., паслязаўтра будзе каштаваць 1 руб. 10 кап. Гэта трэба спыніць. Трэба ўстанавіць устойлівыя цэны на абеды.

Бюро МК даручыла старшыням фабкомаў, сакратарам парткомаў, дырэктарам прадпрыемстваў сурёзна заняцца гэтай справай, пайсці ў сталовую, разгледзець калькуляцыю, адміністрацыйныя выдаткі, колькі ўтрымліваецца людзей, ліпш іх скараціць, даўшы ім іншую работу.

Непармаваны продаж хлеба павінен прывесці да павышэння якасці хлеба. Горад Масква, маючы вельмі добрыя хлебазаводы, знаходзіцца ў прывілеяваным становішчы. Над гэтымі хлебазаводамі мы шмат папрацавалі і забяспечылі Маскву бесперабойным снабжэннем печаным хлебам.

У Маскоўскай вобласці справа хлебапячэння адстае, а ў такіх, напрыклад, абласцях, як Іванаўская, Свярдлоўская з хлебапячэннем абстаіць дрэнна.

Пашырэнне хлебапячэння вытлочна важнае пытанне таму, што цэны на муку ўстаноўлены больш высокія, чым на печаны хлеб. Вось чаму ЦК партыі і ўрад пастанавілі павялічыць сутачную магутнасць хлебазаводаў і хлебапякарань на 10.750 тон. Зараз гэта магутнасць складае 34-35 тысяч тон у суткі, павінна быць 45-46 тыс. тон.

Па Маскве вырашана павялічыць магутнасць хлебапячэння на 50 тон. Зараз Масква выпякае да 2.800 тон хлеба ў дзень.

Вывучэнне пытання паказала, што магутнасць хлебазаводаў поўнасцю не скарыстана. Масква можа абыйсціся без аднаўлення вялікай колькасці старых пякарань, бо хлебазаводы могуць і павінны павялічыць выпечку хлеба добрай якасці.

Што датычыць Маскоўскай вобласці, то становішча там больш складанае. Зараз выпякаецца 2.360 тон хлеба ў суткі.

Урад даручыў нам павысіць выпечку мінімум на 642 тоны хлеба, а мы разлічваем падняць выпечку на 1.500 тон.

Будаўніцтва пякарань і адкрыццё магазінаў раёны абавязаны ўзяць на сябе. З Масквы не ахапіць усе паасобныя куточкі вобласці. Асабліва мы павінны падняць работу кааперацыі—умацаваць яе людзьмі.

Мясцовыя раённыя работнікі павінны заняцца самымі канкрэтнымі пытаннямі арганізацыі хлебапячэння і гандлю.

Што неабходна для арганізацыі пякарні, хоць-бы маленькай: на 2 тоны хлеба? Неабходна адшукаць памяшканне, прывесці яго ў парадак, абсталяваць хлебапякарнымі прыладамі, пабудаваць добрую печ. Трэба падабраць рабочых, забяспечыць іх жыллём. І зрабіць усё гэта літаральна ў два тыдні. Лепшы выхад—знайсці гатовае памяшканне, ушчыльніўшы ўстановы, прыстасаваўшы памяшканні соўтасаў. І кааперацыю можна ўшчыльніць, скарыстаўшы некаторыя яе памяшканні.

Асаблівая ўвага — арганізацыі строгага санітарнага нагляду. Мы не можам дапусціць, каб і ў маленькай пякарні была антысанітарная абстаноўка.

Што датычыць хлебагандлёвай сеткі, то ў кожным магазіне можна адвесці для продажу хлеба адтэлен не ці куток, ачысціць яго, культурна абсталяваць. Трэба адкрыць рад новых магазінаў.

У Маскве, у аддалёных ад цэнтра раёнах, слабая сетка магазінаў. Намі намечана адкрыць 219 новых хлебных магазінаў і 19 лабазаў для продажу зернафуражу. МСПО і Моссовету прыдзецца практычна, у кожным месцы, на кожнай вуліцы паглядзець размяшчэнне магазінаў, улічваючы неабходнасць палепшыць абслугоўванне пакупніка. Калі раней спажыўца прымацоўвалі да магазіна і гаварылі яму: можаш купляць толькі тут, то цяпер становішча мяняецца. Гандлёвая сетка абавязана ўлічваць натуральны попыт спажыўца, натуральны паток пакупніка.

Выключна востра стане пытанне транспарта, падвозкі хлеба. Ні адзін магазін ні на адну гадзіну не павінен быць без хлеба—дастаўка яго павінна рабіцца бесперабойна: МСПО абавязан наладзіць работу транспарта так, каб не было ні сучка, ні задорынкі.

У Маскве ў кожным магазіне, дзе прадаюць хлеб, павінен быць тэлефон, а ў МСПО — рэзерв грузавых аўтамабіляў. Бачыць прадавец, што ў яго хлеб падходзіць к канцу, звоніць па тэлефону: будзьце ласкавы даставіць мне столькі-та хлеба такога-та асартыменту. Рэзервная машына павінна безадкладна даставіць гэты хлеб.

Мы павінны своечасова падрыхтаваць хлебапячэнне, хлебны гандаль да работы па-новаму, да шырокага продажу хлеба з дзяржаўных і кааперацыйных магазінаў. Неабходна дабіцца чоткай і бесперабойнай работы ўсіх органаў, якія праводзяць практычна такое важнае палітычнае мерапрыемства, якім з'яўляецца адмена картачнай сістэмы.

Пераўтварэнне палітаддзелаў МТС і бягучыя пытанні работы ў вёсцы

Пытанне аб пераўтварэнні палітаддзелаў МТС не было нечаканым. У статуце, прынятым на XVII з'ездзе партыі, і ў пастанове па арганізацыйнаму пытанню было спецыяльна падкрэслена, што палітаддзелы ствараюцца, як ударныя органы, і што, па меры мінаванні патрэбы ў гэтых ударных органах, з'езд даручае ЦК ператвараць іх у звычайныя партыйныя органы.

Палітаддзелы адыгралі велізарную ролю. Няма чаго многа гаварыць наконт таго, што стварэнне палітаддзелаў было найбуйнейшым палітычным мерапрыемствам партыі. Як у свой час Ленін у сваёй «Што рабіць» і ў артыкулах ставіў вакол арганізацыйных пытанняў важнейшыя пытанні палітыкі, так тав. Сталін у сувязі з арганізацыйнымі пытаннямі стварэння палітаддзелаў паставіў на студзеньскім пленуме ЦК усе пытанні калгаснага руху і нашай работы ў вёсцы.

Арганізацыя палітаддзелаў была па сутнасці мабілізацыяй усёй партыі, усяго рабочага класа на вырашэнне найскладанейшых задач умацавання калгасаў і забеспячэння перамогі калгаснага ладу.

Лістападаўскі пленум ЦК, падводзячы вынікі работы ў вёсцы, як у галіне палітычнай, так і ў галіне гаспадарчай, устанавіў, што наша вёска палітычна ўмацавалася, што ў калгасах створан шырокі актыў беспартыйных калгаснікаў, згуртаваны вакол партыі. Наша вёска зараз не тая, што была два гады назад. Хоць астаткі кулацтва яшчэ да канца не ліквідаваны і сям-там аказваюць супраціўленне, але калгасны лад перамог канчаткова.

Совецкае сялянства беспаваротна стала пад чырвоныя сцягі сацыялізма. **(Бурныя апладысменты).**

Пад уплывам новых метадаў работы палітаддзелаў перабудаваліся таксама нашы раённыя камітэты партыі. Яны сталі працаваць лепш — гэта факт. Гэтым самым было падрыхтавана пытанне аб пераўтварэнні палітаддзелаў у нармальныя раённыя партыйныя органы.

Кожны палітаддзельшчык разумее, што ў цяперашніх умовах перад партыяй стаяць яшчэ больш сур'ёзныя задачы ў галіне сельскай гаспадаркі. Перад палітаддзеламі Цэнтральны Камітэт паставіў баявую вытворчую задачу—палепшыць кіраўніцтва калгасамі, умацаваць калгасы. Да гэтага далаецца зараз новае — **палепшыць кіраўніцтва сельсоветамі, сельпо, падняць культурную работу, ахову здароўя і завяршыць стварэнне на вёсцы сапраўды баявой большэвіцкай партыйнай арганізацыі.**

Раённыя камітэты партыі, з якімі саллюцца палітаддзелы МТС, павінны будуць узяць на сябе непасрэднае кіраўніцтва калгасамі, калгаснымі первічнымі парторганізацыямі. Значэнне райкомаў значна ўзрастае. Ускладняецца і іх работа. У сувязі з гэтым буйныя, грамоздкія раёны падзяляюцца на два-тры раёны. За аснову новых раёнаў бярэцца тэрыторыя дзейнасці адной з МТС.

Пленум ЦК не ўстанавіў колькасці нова-арганізуемых раёнаў, гэта пытанне павінна быць прапрацавана абкомамі і крайкомамі. Прыкладна, называлася 500-800 новых раёнаў па ўсяму Совецкаму Саюзу.

Для таго, каб абласныя і краёвыя органы маглі лепш, канкрэтней кіраваць раёнамі, колькасць якіх павялічваецца, рад абласцей і краёў, з вялікай колькасцю раёнаў разузбуйняецца.

Да лістападаўскага пленума ЦК былі ўжо падзелены на дзве часткі Паўночна-Каўказскі край, Ніжне-Волжскі край і Цэнтральная Чарназёмная вобласць, на тры часткі Уральская вобласць. Пасля лістападаўскага пленума ЦК падзелены Горкаўскі і Сярэдне-Волжскі краі. І шляхам выдзялення раёнаў з Усходне-Сібірскага, Заходне-Сібірскага краёў і Чэлябінскай вобласці створаны Краснаярскі край і Омская вобласць. Абмяркоўвалася пытанне і аб падзеле Маскоўскай вобласці, але ў даны момант гэта пытанне не стаіць на парадку дня. У Маскоўскай вобласці намячаецца стварыць 25-26 новых раёнаў.

Зараз у нас 146 раёнаў, будзе, калі ўлічыць зліццё некаторых раёнаў, 160-165 раёнаў.

У райкомах стараюцца сельгасаддзелы, а ў найбольш буйных райкомах уводзяцца другія сакратары. Сельгасаддзелам павінен ведаць або першы, або другі сакратар. У дырэктара МТС будзе намеснік па палітычнай частцы.

Трэба з самага пачатку рашуча перасячы настрої: раз палітаддзелы МТС пераўтвараюцца—зліваюцца з райкомамі, значыць зняты, вырашаны тыя ўдарныя задачы, якія былі ўскладзены на палітаддзелы, значыць ужо ўсюды справа абстаіць добра, значыць можна знізіць напружанасць, працаваць спакайней, «з прахладцай», адпачнуць, «паспаць».

Няма нічога больш шкоднага падобных настрояў. Іх якраз можа скарыстаць класавы вораг. А к таму-ж не забывайце, што нават у раёнах, дзе «сярэднія» лічбы вельмі ўцяшальныя, ёсць адсталыя калгасы, такія куткі, дзе яшчэ працстаіць разгарнуць усю работу.

Зліццё палітаддзелаў МТС з райкомамі значна ўзмацняе адказнасць райкома і маскоўскага камітэта партыі за **непасрэднае** кіраўніцтва калгасамі, у першую чаргу за становішча адсталых калгасаў, за работу ў адсталых вёсках — з перанясжаннем аднаасобнікаў. Райкомы не толькі павінны пераняць учорашні вопыт сувязі, метады работы палітаддзелаў, але паставіць усю работу на вёсцы на яшчэ большую вышыню, а для гэтага ўсе высковыя комуністы павінны працаваць яшчэ больш энергічна, быць яшчэ больш пільнымі, не аслабляць ні па секунду ўзятых тэмпаў.

Цэнтральны Камітэт будзе заклікаць усіх сакратароў райкомаў і намеснікаў дырэктароў МТС па палітычнай частцы. Усе работнікі палітаддзелаў абавязаны застацца ў вёсцы.

Палітаддзельцы павінны зразумець усім сваім большэвіцкім нутром: тое, што мы дасягнулі ў вёсцы, трэба ўсямерна замацаваць. Было-б недапушчальнай лёгкадумнасцю з нашага боку, калі-б адборныя большэвікі-палітаддзельцы, накапічуўшы вялікі вопыт, зараз ушлі з вёскі. Не, таварышы, палітаддзельцы не толькі адыгралі, але і яшчэ адыграюць вялікую палітычную ролю. Вы падрыхтуйце быстра растучых у калгасах арганізатараў;

падыміце ўсю работу ў вёсцы;

дапамажыце партыі канчаткова ўмацаваць калгасы;

забяспечце быстры пад'ём жывёлагадоўлі;

яшчэ больш умацуйце ўплыў партыі сярод беспартыйных калгаснікаў;

выкарыйце і дабіце на канцы паслядкаў кулацтва.

А тады... тады, мы пераконаны, цяперашнія высковыя цэнтры не ўступяць па культуры гарадскім, і нават тыя паасобныя таварышы, якія імкнуцца зараз уйсці з вёскі, яны з вёскі ўходзіць не захочуць. Вёска ператворыцца ў сапраўдны цэнтр сацыялістычнай культуры, з усім тым, што ўласціва культуры совецкіх гарадоў! **(Апладысменты).**

Што нам неабходна яшчэ многа працаваць у вёсцы, паказваюць і бягучыя пытанні, якія абмяркоўваліся пленумам Цэнтральнага Камітэта.

Тры чвэрткі сялянскіх гаспадарак нашай краіны калектывізаваны. 90 проц. пасеўнай плошчы належыць калгасам. Аднак, у нас ёсць рад вёсак, дзе яшчэ захавалася значная частка аднаасобнікаў. Мы абавязаны ўзмацніць работу сярод аднаасобнікаў. Аднаасобніка трэба палітычна выхоўваць, над ім трэба працаваць.

Цэнтральны Камітэт партыі выбраў спецыяльную камісію. Гэта камісія ў бліжэйшы час распрацуе пытанні аб індывідуальнай сялянскай гаспадарцы і адсталых калгасах.

У якасці аднаго з мерапрыемстваў па ўмацаванню калгасаў і паляпшэнню іх работы пленум ЦК намеціў спісанне старой запазычанасці па сельска-гаспадарчых пазыках, выданых калгасам да 1-га студзеня 1933 года. Гэта складае па краіне каля 435 мільёнаў рублёў, а па Маскоўскай вобласці — каля 16 млн. рублёў. Няма чаго даказваць, што спісанне старой запазычанасці з калгасаў — вялікае гаспадарчае і палітычнае мерапрыемства совецкай дзяржавы.

Мы распрацавалі рад мер, у прыватнасці, па Маскоўскай вобласці, для паляпшэння работы адсталых калгасаў. У нас ёсць калгасы, якія не маюць цягавай сілы, дзе няма правільнага севазвароту дзе становішча інвентару вельмі адсталае. Нарэшце, у частцы калгаснікаў яшчэ няма карэў. Гэтыя пытанні мы абавязаны вырашыць у самы бліжэйшы час.

Мы павінны падняць ролю агульнага калгаснага сходу. Праўленне часта змазвае значэнне агульнага сходу калгаснікаў, а раёны не заўсёды сур'ёзна ўлічваюць запатрабаванні калгасаў. На пленуму прыводзіліся факты, калі старшыні калгасаў геракідаюць з аднаго калгаса ў другі, не лічачыся з калгасамі, не ўлічваючы таго, што старшыня ўжо вынучыў гаспадарку, ведае людзей. Усё гэта трэба спыніць.

ЦК пастанавіў сабраць у часе з'езда советаў другі ўсесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў для выпрацоўкі статута сельска-гаспадарчай арцелі і мер па далейшаму згуртаванню калгасаў, як актыўных будаўнікоў соцыялістычнай гаспадаркі.

Апрача таго пленум абмеркаваў пытанне аб камбайнах і камбайнерах. Камбайн — вельмі складаная і вельмі добрая машына, без якой нам цяжка справіцца з вялікай пасеўнай плошчай. Вось чаму мы ўводзім зараз штатных камбайнераў, якія будуць атрымліваць у МТС пастаянную заработную плату. Гэта забяспечыць выкананне камбайнамі адпаведнай нормы выпрацоўкі і поўнасцю сябе акупіць.

Пытанні жывёлагадоўлі абмяркоўваліся на мінулым — ліпеньскім пленуме ЦК. Лістападаўскі пленум заслухаў дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі ў 1935 г. па кожнай вобласці. Гэты план прадугледжвае значны рост стада, асабліва маладняка па ўсіх абласцях і рэспубліках.

Зіма гэтага года з'яўляецца рашаючай у захаванні пагалоўя і вырошчванні маладняка. І нам, масквічам, прыдзецца як след над гэтым папрацаваць.

На пленуме МК стаіць пытанне аб масавай зімовай рабоце на вёсцы. Трэба мець на ўвазе, што падняцце гаспадаркі, умацаванне магутнасці калгасаў і соўгасаў вырашаецца перш за ўсё арганізацыяй жывых людзей, вырашаецца палітычнай работай.

Гэта адносіцца і да горада. Мы павінны работу ў масах, унутры партыйнай арганізацыі ўзняць на куды большую, чым гэта было да гэтага часу, ідэйную і палітычную вышыню.

Тав. **Сталін** не раз падкрэсліваў, што многія з нашых партыйцаў не разумеюць сутнасці сапраўднай арганізатарска-большэвіцкай работы, замяняюць яе толькі дакладамі, здёмамі, рэзалюцыямі. Сапраўдная арганізатарская палітычная работа гэтым не можа абмяжоўвацца. Неабходна **добра ведаць партыйны і беспартыйны актыў, весці работу з кожным індывідуальна не зарывацца ў канцылярыях, а шчыльна падыйсці да жывой справы, да жывога чалавека.** Так трэба арганізаваць работу і ў вёсцы, і ў горадзе.

Мы за тое, каб усімі спосабамі падымаць масы на шырокіх сходах. І мы трэбуем у той-жа час, каб партыйны арганізатар на заводзе, у вёсцы, у калгасе асабіста ведаў людзей, каб ён быў з ім звязан, каб ён гутарыў з імі, каб ён штодзень канкрэтна адказваў на запросы рабочага і калгасніка.

Знішчым з коранем астаткі класавых ворагаў! Яшчэ цясней згуртуемся вакол ЦК партыі і таварыша Сталіна!

Таварышы! Мы маем велізарныя палітычныя дасягненні, гіганцкія гаспадарчыя поспехі ва ўсім нашым соцыялістычным будаўніцтве. Апошні пленум Цэнтральнага Камітэта з'явіўся бліскучым і яркім паказальнікам усёй велічы пройдзенага намі шляху. Адсталую, слабую, поўдзікую Расію наша партыя і рабочы клас пад кіраўніцтвам т. Сталіна перарабілі ў вялікую, культурную, магутную соцыялістычную краіну.

Пленум ЦК падвёў вынікі нашай эканамічнай палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі, гандлю і прамысловасці. Мы абмеркавалі палітычныя вынікі нашай барацьбы за кіраўніцтва мільённымі масамі сялянства, якіх партыя павяла за сабой, павяла моцна і беспаваротна.

Мы шпарка ідзем наперад. Краіна на высокім уздыме. Ворагі імкліва коцяцца ўніз. Але чым большая адлегласць паміж нашым уздымам і скатам ворагаў уніз, тым больш дзікай, бязсільнай злосці ў гэтых класавых ворагаў. Вось чаму нам трэба не паслабляць сваёй класавай пільнасці.

Пільнасць патрабуе не толькі памятаць аб ворагу. Пільнасць **патрабуе, каб мы ўдзесяцерылі сваю барацьбу, каб мы ўдзесяцерылі сваю ідэйна-палітычную і арганізатарскую работу. Пільнасць патрабуе, каб мы скрозь і ўсюды разілі ворагаў, да канца выкарчоўвалі яго астаткі.**

Цяжкі ўдар, які партыя панесла 15 дзён таму назад, паказвае нам, што класавы вораг не злажыў зброі. Гэты вораг пралязае і ў нашы ўласныя рады. Разгромлены, раздаўлены ідэйна-палітычна, адкінуты самымі масамі, якія пашлі за Цэнтральным Камітэтам нашай партыі і перамаглі, —гэты вораг, дэманструючы сваё бязсілле, у дзікай злосці зварачаецца да тэрарыстычных актаў.

Мы ведаем таварыша Кірава не толькі як палкага народнага трыбуна, бясстрашнага байца, талантлівага арганізатара перамог на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва. Мы ведаем Кірава, як арганізатара перамог над галлю, над подлай, гнуснай, антысовецкай зіноўеўскай апазіцыяй! **(Бурныя апладысменты).**

Іменна таму ненавісныя контрэволюцыйныя падонкі зіноўеўскай антыпартыйнай групы забілі таварыша Кірава. Разгромленыя ў адкрытай палітычнай барацьбе, бязсільныя і азлобленыя, яны звярнуліся да апошняга белабандыцкага фашысцкага сродку — да індывідуальнага тэрору.

Следства аб забойстве таварыша Кірава яшчэ не закончана, але ўжо дакладна ўстаноўлена існаванне тэрарыстычнага, контрэволюцыйнага падпольнага «Ленінградскага цэнтра», які складаўся з членаў былой зіноўеўскай апазіцыі. Па прамому даручэнню гэтага цэнтра забойца Нікалаеў, адзін з членаў гэтага цэнтра — зрабіў сваю гнусную справу.

У дзікай злосці на поспехі пролетарскай дыктатуры, подлыя адшчапенцы марылі аб згортванні індустрыялізацыі і зрыве ўсяго соцыялістычнага будаўніцтва. Аб'яднаўшыся на антысовецкай зіноўеўскай платформе, яны выконвалі справу класавага ворага.

Шматгадовая антыпартыйная, правакатарская, антысовецкая «работа» зіноўеўскай групы завяршылася каварным труслівым стрэлам іх падонкаў з-за вугла ў спіну нашага дарагога таварыша Кірава—любімага правадыра пролетарыята і партыі, палкага народнага трыбуна, стойкага большэвіка!

Страціўшы якую-б там ні было надзею на падтрыманне мас, нікчэмная замкнутая кучка зіноўеўскіх паслядкаў хацела сваім стрэлам унесці замяшанне ў рады пролетарыята, падарваць магутнасць нашай партыі, затрымаць пабеданосны рух нашай краіны к соцыялізму, павярнуць назад калясо гісторыі.

Дарэмны і нікчэмны гэтыя спробы! Большэвікоў не запалохаць. Мільённыя масы пролетарыята і працоўных нашай вялікай радзімы пасля смерці свайго любімага Міроныча яшчэ больш упарта сталі змагацца і працаваць на ўсіх участках соцыялістычнай будоўлі, яшчэ больш рашуча вядуць разгорнутае соцыялістычнае наступленне, яшчэ больш бязлітасна распраўляюцца з гнуснымі атрэпі'мі класавых ворагаў. Уся краіна яшчэ цясней згуртавалася вакол партыі, вакол любімага Сталіна, вакол таго, хто вёў і вядзе вялікай з усімі ворагамі ленінізма, хто кожны дзень, кожную гадзіну вучыць партыю майстэрству распазнаваць ворага ў самым зародку і бязлітасна, да канца разбіваць яго, хто забяспечыў перамогу і сталёвае адзінства большэвіцкіх радоў **(Бурныя апладысменты, усе стоячы апладзіруюць. Выгукі: «ура», «Няхай жыве таварыш Сталін!»).**

АБВІНАВАУЧАЕ ЗАКЛЮЧЭННЕ

па справе Нікалаева Л. В., Каталынава І. І., Мяснікова Н. П., Шатскага Н. Н., Мандэльштама С. О., Сокалава Г. В., Звездова В. І., Юскіна І. Г., Румянцэва В. В., Антонава Н. С., Ханік Л. О., Толмазава А. І., Левіна В. С. і Сасіцкага Л. І.—абвінавачваемых у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-8 і 58-11 к. к. РСФСР.

1-га снежня 1934 года ў 16 гадзін 30 мінут у горадзе Ленінградзе, у Смольным стрэлам з рэвальвера быў забіт член прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР, член палітбюро ЦК ВКП(б) і сакратар Цэнтральнага і Ленінградскага камітэтаў ВКП(б) таварыш Сергей Міронавіч КІРАЎ.

Затрыманы на месцы злачынства забойца аказаўся НІКАЛАЕВЫМ Леанідам Васільевічам, 30-ці год. служачым, выключаным у сакавіку 1934 года з радоў ВКП(б) за парушэнне партыйнай дысцыпліны, але затым адноўлены ў правах члена партыі, з прычыны яго заявы аб сваім раскаянні.

Праведзеным па данай справе расследваннем устаноўлена, што НІКАЛАЕЎ Л. В. з'яўляўся членам контррэволюцыйнай тэрарыстычнай падпольнай групы, якая стварылася з ліку ўдзельнікаў былушай зіноўеўскай антысавецкай групы ў Ленінградзе, і што забойства тав. КІРАВА С. М. было зроблена НІКАЛАЕВЫМ Л. В. па даручэнню тэрарыстычнага падпольнага «ленінградскага цэнтра».

АФАРМЛЕННЕ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ТЭРАРЫСТЫЧНАЙ ПАДПОЛЬНАЙ ГРУПЫ У ГОР. ЛЕНІНГРАДЗЕ

Следствам устаноўлена, што на гледзячы на капітуляцыю былушай зіноўеўскай антысавецкай групы, падпольная работа найбольш актыўных удзельнікаў гэтага блока не спынілася і прадаўжалася да самага апошняга часу. Асабліва актывізавацца гэта дзейнасць пачала ў 1933-34 гг., калі ў горадзе Ленінградзе стварылася з ліку былых удзельнікаў зіноўеўскай групы падпольная контррэволюцыйная тэрарыстычная група на чале з так званым «ленінградскім цэнтрам».

З поваду ўзнікнення і арганізацыйнага афармлення гэтай групы абвінавачваемы ЗВЕЗДОЎ паказаў:

«...Арганізацыйнае афармленне нашай групы адбывалася паступова, прычым у ролі асноўных арганізатараў выступалі РУМЯНЦЭЎ Владзімір і КАТАЛЫНАЎ Івен...» (том І-шы, ліст справы 196).

Абвінавачваемы СОКАЛАЎ Г. В. у сваіх паказаннях ад 7, 9 і 12 снежня г. г. таксама пацвердзіў гэтыя акалічнасці, падкрэсліўшы, што:

«...Пачынаючы з восені 1934 года, члены групы пачынаюць актывізаваць свае сувязі, устанаўляюць паміж сабой больш цесны кантакт...

Група па сутнасці аб'ядналася на аснове старой зіноўеўскай платформы»... (том І-шы, ліст справы 249).

Яшчэ больш поўны малюнак арганізацыйнага афармлення гэтай контррэволюцыйнай падпольнай тэрарыстычнай групы даў у сваіх паказаннях абвінавачваемы ХАНІК Л. О., пацвердзіўшы, што ён:

«...сапраўды ўваходзіў у склад гэтай групы, якая стварылася, як ён сказаў, на базе былушага трацкісцка-зіноўеўскага блока...

Арганізацыя наша канчаткова аформілася ў 1933 годзе...» (том 2-гі, ліст справы 33).

Як устаноўлена следствам, на чале гэтай групы стаяў тэрарыстычны падпольны «ленінградскі цэнтр», у склад якога ўваходзілі: КАТАЛЫНАЎ І. І., ШАТСКІ Н. Н., РУМЯНЦЭЎ В. В., МАНДЭЛЬШТАМ С. О., МЯСНІКОЎ Н. П., ЛЕВІН В. С., САСІЦКІ Л. І. і НІКАЛАЕЎ Л. В.—усе былыя члены зіноўеўскай апазіцыі.

Гэта пацвярджаецца як паказаннямі самых членаў гэтага цэнтра, так і паказаннямі другіх удзельнікаў ленінградскай падпольнай антысавецкай групы.

Так, абвінавачваемы РУМЯНЦЭЎ В. В. паказаў:

«...ЛЕВІН ВЛАДЗІМІР, я—РУМЯНЦЭЎ, МАНДЭЛЬШТАМ Сергей, КАТАЛЫНАЎ Івен, МЯСНІКОЎ Нікалай і САСІЦКІ Леў уваходзілі ў склад цэнтра контррэволюцыйнай арганізацыі зіноўеўцаў у Ленінградзе.

Члены цэнтра ў інтарэсах канспірацыі збіраліся вельмі рэдка разам, звычайна-ж сувязь падтрымліваліся персональна паміж асобнымі членамі цэнтра...» (том 2-гі, ліст справы 3).

Па гэтаму пытанню абвінавачваемы МАНДЭЛЬШТАМ С. О. паказаў:

«... К гэтаму-ж часу адносіцца афармленне ленінградскага цэнтра нашай арганізацыі ў складзе: мяне — МАНДЭЛЬШТАМА, РУМЯНЦЭВА Владзіміра, ЛЕВІНА Владзіміра, САСІЦКАГА, — існуючага ў такім-жа відзе да гэтага часу...» (том 2-гі, ліст справы 250).

Абвінавачваемы Мяснікоў, запытаны з поваду складу «ленінградскага цэнтра», паказаў, што ў гэты цэнтр уваходзілі: ЛЕВІН В. С., РУМЯНЦЭЎ В. В., КАТАЛЫНАЎ І. І., САСІЦКІ і ён сам. (том 2-гі, ліст справы 108).

У гэтым-жа паказанні Мяснікоў паведаміў аб размеркаванні функцый паміж асобнымі членамі гэтага цэнтра.

Аб кіруючай ролі ў падпольнай антысавецкай групе зіноўеўцаў РУМЯНЦЭВА, ЛЕВІНА і КАТАЛЫНАВА гаворыць таксама і абвінавачваемы ХАНІК (том 2-гі, ліст справы 33-34).

Да гэтага-ж «Ленінградскага цэнтра» падпольнай антысавецкай тэрарыстычнай групы належаў і забойца тав. С. М. КІРАВА — Л. В. НІКАЛАЕЎ.

Аб удзеле абвінавачанага НІКАЛАЕВА ў гэтай групе абвінавачаны ЗВЕЗДОЎ паказаў:

«... Ён (г. зн. НІКАЛАЕЎ ЛЕАНІД) быў звязан з намі на працягу доўгага часу, пачынаючы з 1924 года. Ён працаваў адзін час пад непасрэдным кіраўніцтвам КАТАЛЫНАВА, калі апошні быў сакратаром Выбаргскага райкома ВЛКСМ. Нікалаеў і быў выхаван намі, жывіўся ідэйнымі сокамі нашай групы і несумненна ўспрыняў увесь вопыт нашай фракцыйнай барацьбы супроць партыі і паготыйнага кіраўніцтва.

Аб НІКАЛАЕВЕ трэба яшчэ сказаць, што ён адносіцца да катэгорыі замкнутых людзей, гатовых, аднак, да рашучых дзеянняў...» (том першы, ліст справы 199).

Аб удзеле НІКАЛАЕВА ў падпольнай контррэволюцыйнай групе, з ліку былых зіноўеўцаў паказалі таксама абвінавачаныя СОКАЛАЎ, АНТОНАЎ, КАТАЛЫНАЎ, ХАНІК, ЮСКІН і ШАТСКІ.

Сам НІКАЛАЕЎ Л. В. у паказаннях ад 13-га снежня г. г. пацвердзіў, што ўваходзіў у групу былых апазіцыянераў у складзе КАТАЛЫНАВА, ШАТСКАГА, ЮСКІНА і інш., праводзіўшую контррэволюцыйную работу, дадаўшы:

«... Удзельнікі групы сталі на платформе трацкісцка-зіноўеўскага блока. Лічылі неабходным змяніць існуючае партыйнае кіраўніцтва ўсімі магчымымі сродкамі...» (том 1, ліст справы 266).

Як устаноўлена следствам, уся работа падпольнай контррэволюцыйнай тэрарыстычнай групы працякала ва ўмовах строгай канспірацыі. Аб строга-канспіратыўным характары адносін унутры гэтай групы гаворыць пітаральна ўсе прыцягнутыя па данай справе ў якасці абвінавачаных члены гэтай групы. У прыватнасці, абвінавачаны ХАНІК паказаў:

«З меркаваннямі канспірацыі весткамі аб арганізацыйнай пабудове арганізацыі распалагалі толькі адны члены цэнтра. Аднак, як споў РУМЯНЦЭВА мне вядома, што арганізацыя наша мела рад звенняў, размешчаных у мясцах канцэнтрацыі молодзі...» (том 2-гі, ліст справы 35).

Аб законспіраванасці падпольнай контррэволюцыйнай групы гаворыць у сваіх паказаннях і абвінавачваемы МЯСНІКОЎ, які з'яўляўся адным з кіраўнікоў ленінградскай групы, па ўказанню якога на адной з кватэр удзельнікаў гэтай групы быў із'ят поўны архіў трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі.

МЭТЫ І МЕТАДЫ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ПАДПОЛЬНАЙ ТЭРАРЫСТЫЧНАЙ ГРУПЫ

Папярэднім следствам устаноўлена, што асноўнай задачай падпольнай контррэволюцыйнай тэрарыстычнай групы з'яўлялася імкненне дэзарганізаваць кіраўніцтва совецкага ўрада шляхам тэрарыстычных актаў, накіраваных супроць галоўных кіраўнікоў совецкай улады, і дабіцца такім шляхам змены цяперашняй палітыкі ў духу так званай зіноўеўска-трацкісцкай платформы.

Страціўшы ўсякую надзею на падтрыманне мас, прадстаўляючы сабой замкнутую і палітычна асуджаную антысавецкую групу, яе ўдзельнікі, з прычыны безнадзейнасці ажыццяўлення сваіх мэт, сталі на шлях прамога тэрору.

Абвінавачваемы ХАНІК, адзін з актыўных членаў гэтай групы, характарызуючы яе «ідэйна-палітычныя» ўстаноўкі, прызнаў, што яны выцякалі «з платформы трацкісцка-зіноўеўскага блока на падрыў аўтарытэту існуючага партыйнага кіраўніцтва і замену гэтага кіраўніцтва лідэрамі нашай арганізацыі — ЗІНОЎЕВЫМ, КАМЕНЕВЫМ і інш., якія з'яўляюцца прыхільнікамі змены зараз правадзімага партыйнага курса...» (том 2-гі, ліст справы 35).

Абвінавачаны ХАНІК далей паказаў:

«... Кіраўнікі нашай арганізацыі пастаянна ўказвалі, што усё зло выходзіць ад цяперашняга кіраўніцтва партыі — СТАЛІНА МОЛАТАВА, КАГАНОВІЧА і КІРАВА. У сувязі з гэтым лідэры нашай арганізацыі прывівалі нам, у асабліваасці так званай моладзі, погляды, што ў краіне будуць прадаўжацца затрудненні (дасягненні ў разлік не бралася) да таго часу, пакуль цяперашняе кіраўніцтва будзе ўзначальваць партыю.

Адсюль, ад гэтых контррэволюцыйных установак і перакананняў, стаў магчымы той тэрарыстычны акт, які быў зроблен супроць КІРАВА членам нашай арганізацыі НІКАЛАЕВЫМ Леанідам...» (том 2-гі, ліст справы 35).

Акалічна характарызуе паказаўшыя ў гэтай групе настрої і абвінавачаны РУМЯНЦЭЎ, які сам з'яўляецца, згодна характарыстыкі другога абвінавачанага ТОЛМАЗАВА, «найбольш выразным прыхільнікам тэрарыстычных метадаў дзеяння».

Абвінавачаны РУМЯНЦЭЎ прызнаў, што

«ў такой накалёнай атмасферы вострай нянавісці да кіраўніцтва ВКП(б) не мог не ўзрошчвацца настрой тэрарыстычнага парадку...» (том 2-гі, ліст справы 9).

«... Прамым заключэннем такіх настроеў, — паказаў абвінавачаны ТОЛМАЗАЎ, — і з'явіўся стрэл НІКАЛАЕВА Леаніда ў КІРАВА...».

Па поваду тэрарыстычных метадаў барацьбы, усвоеных гэтай падпольнай контррэволюцыйнай групай, даў вычарпальныя паказанні і абвінавачаны НІКАЛАЕЎ Л. В.

«...Мы не магілі, — паказаў ён, — чакаць змянення партыйнага кіраўніцтва метадамі ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. Аддавалі сабе адчот, што гэты шлях зусім выключан. Адсюль аставалася адна дарога — дарога тэрарыстычных актаў.

Калі я страляў у КІРАВА, я разважаў так: наш стрэл павінен з'явіцца сігналам узрыву к выступленню ўнутры краіны супроць ВКП(б) і совецкай улады...» (том 2-гі, ліст справы 35).

Не спадзяючыся, аднак, на ажыццявімасць такога роду выступленняў «унутры краіны», указаная група ставіла прамую стаўку на дапамогу «извне» — на ўзброеную інтэрвенцыю і дапамогу з боку некаторых замежных дзяржаў.

Надзея на інтэрвенцыю, як на адзіны спосаб захоўвання совецкай улады, выразна характарызуе погляды і самога абвінавачанага НІКАЛАЕВА, не ўтойваўшага гэтага ад найбольш блізкіх яму людзей.

Так, дапытаны па данай справе ў якасці сведкі брат НІКАЛАЕВА Леаніда — НІКАЛАЕЎ Пётр паказаў:

«...Леанід гаварыў мне таксама, што скінуць совецкую ўладу магчыма толькі шляхам нападу на яе замежных капіталістычных дзяржаў і што ён будзе ўсімі мерамі дапамагаць будучы за граніцай, усякай капіталістычнай дзяржаве, якая нападзе на Совецкі Саюз, каб скінуць совецкую ўладу»... (том 3-ці, ліст справы 199).

Аналагічнае паказанне даў і другі сваяк НІКАЛА�ЕВА, таксама дапытаны ў якасці сведкі па данай справе—гр. КУЛІШЭР Р. М.

«Леанід НІКАЛАЕЎ заявіў мне, што трэба чакаць у бліжэйшы час інтэрвенцыі супроць Совецкага Саюза, прычым змест гэтай яго заявы і характар яго выказвання былі такімі, што ён, Л. НІКАЛАЕЎ быў-бы задаволеным, калі-б інтэрвенцыя сапраўды мела месца». (Том 3-ці, ліст справы 262).

Следствам устаноўлена, што абвінавачаны НІКАЛАЕЎ, згодна папярэдняга ўгавору з членам «ленінградскага цэнтра» абвінавачаным КАТАЛЫНАВЫМ, не раз наведваў..... консула ў г. Ленінградзе...,.., з якім вёў перагаворы аб магчымых формах дапамогі гэтай групе і якому НІКАЛАЕЎ даў інфармацыю па некаторых, цікавячых консула, пытаннях:

«...Я ўказаў,—гаворыць НІКАЛАЕЎ у сваім паказанні ад 20 снежня 1934 года,—што мы заўсёды гатовы дапамагчы консулу правільным асвятленнем таго, што робіцца ўнутры Совецкага Саюза. Тут я меў на ўвазе разгавор з ШАТСКІМ і КАТАЛЫНАВЫМ аб неабходнасці заснаваць консульства матэрыялам антысавецкага характару аб унутраным становішчы Совецкага Саюза.

Далей, я прасіў консула аказаць нам матэрыяльную дапамогу, указаўшы, што атрыманыя ад яго грошы мы вернем яму, як толькі зменяцца нашы фінансавыя справы.

На наступнай сустрэчы — трэцяй ці чацвертай у будынку консульства—консул паведаміў мне, што ён згодзен задаволіць мае просьбы, і ўручыў мне пяць тысяч рублёў.

Пры гэтым сказаў, што ўстанавіць сувязь з ТРОЦКІМ ён можа, калі я ўручу якое-небудзь пісьмо ад групы к Троцкаму.

Аб сваёй гутарцы з консулам я паведаміў КАТАЛЫНАВУ, перадаўшы яму атрыманыя грошы ў размеры 4.500 рублёў, а 500 рублёў аставіў сабе...» (том 2-гі, ліст справы 280).

Такім чынам, мэты і метады барацьбы гэтай контррэволюцыйнай тэрарыстычнай групы ў г. Ленінградзе поўнасцю супадаюць з мэтамі і метадамі адкрытых ворагаў народа —эміграцыйных белагвардзейскіх памешчыцка-капіталістычных арганізацый — «российский общевоинский союз» і «братство русской правды» (дзенікінцы), якія адкрыта прапагандуюць тэрор, сістэматычна перакідваюць на тэрыторыю СССР сваіх агентаў у мэтах арганізацыі і правядзення тэрарыстычных актаў супроць прадстаўнікоў совецкай улады і ажыццёвілі забойства тав. ВАРОЎСКАГА В. В і тав. ВОЙКАВА П. Л.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗАБІЙСТВА тав. КІРАВА

У працэсе расследвання было ўстаноўлена, што ў Ленінградзе ў гэты перыяд часу дзейнічалі дзве тэрарыстычныя групы. Адна з іх узначальвалася членам «ленінградскага цэнтра» КАТАЛЫНАВЫМ, і ў яе ўваходзілі: НІКАЛАЕЎ, ЗВЕЗДОЎ, АНТОНАЎ, СОКАЛАЎ і ЮСКІН.

Другая група, паводле споў таго-ж НІКАЛАЕВА, дзейнічала пад кіраўніцтвам ШАТСКАГА Н. Н.

«...Група КАТАЛЫНАВА, — паказаў далей НІКАЛАЕЎ,—падрыхтоўвала тэрарыстычны акт над КІРАВЫМ, прычым непасрэднае яго ажыццяўленне было ўскладзена асабіста на мяне.

Мне вядома ад ШАТСКАГА, што такое-ж заданне было дадзена і яго групе, прычым гэта работа вялася ёю незалежна ад нашай падрыхтоўкі тэрарыстычнага акта. Ведаю ад КАТАЛЫНАВА, што яго група рыхтавала тэрарыстычны акт над СТАЛІНЫМ, скарыстоўваючы пры гэтым тыя-ж сувязі, якія яна мела ў Маскве. Як указана мною ў пратаколе допыту ад 6 снежня 1934 года, ШАТСКІ і, як відаць, яго група, таксама праводзілі падрыхтоўку тэрарыстычнага акта над СТАЛІНЫМ. Такім чынам, кожная з груп мела спецыяльныя ўказанні па тэрору, ажыццяўляючы іх незалежна адна ад другой, хоць непасрэдныя мэты нярэдка супадалі. Гэта відаць з таго, як ішла падрыхтоўка забойства КІРАВА, якое падрыхтоўвалася мною, пераважна ў раёне Смольнага, а ШАТСКІМ, галоўным чынам, у раёне кватэры КІРАВА...» (том 1-шы, ліст справы 273-274).

Гаворачы аб ролі ў гэтай справе ШАТСКАГА, НІКАЛАЕЎ паказаў:

«...Шатскага (упершыню я сустрэў у 1933 годзе. Наступная сустрэча ў нас была летам 1934 года на вуліцы Красных зор, дом № 28, дзе ШАТСКІ праводзіў назіранне за кватэрай КІРАВА, а сваю ўвагу перанёс к Смольнаму і намецію КІРАВА забіць у гэтым пункце...». (том 1-шы, ліст справы 50-51).

Што датычыць акалічнасцей, якія непасрэдна прадшэствавалі прыняцю абвінавачаным НІКАЛАЕВЫМ канчатковага рашэння аб ажыццяўленні тэрарыстычнага акта супроць тав. С. М. КІРАВА, то яны рысуюцца ў наступным выглядзе:

Блізка ведаючы НІКАЛАЕВА з 1922 года па рабоце ў Выбаргскім раёне і асабліва зблізіўшыся з ім у апошнія гады, абвінавачваемы КАТАЛЫНАЎ у адну са сваіх сустрэч з НІКАЛАЕВЫМ увосень 1934 года прама паставіў перад апошнім пытанне аб забойстве тав. КІРАВА.

Вось як паказвае аб гэтай гутарцы сам абвінавачаны НІКАЛАЕЎ:

«...Гэта было ў сярэдзіне верасня пасля сустрэчы з ШАТСКІМ у жніўні 1934 года. КАТАЛЫНАЎ загаварыў са мной аб рабоце контррэволюцыйнай арганізацыі зіноўеўцаў. Ён спаслаўся на маю жывіцельную гутарку з ШАТСКІМ і прапанаваў пачаць работу... З гэтай гутаркі КАТАЛЫНАЎ мог вывесці заключэнне, што я падрыхтован на правядзенне самых крайніх дзеянняў, уключаючы правядзенне тэрарыстычнага акта. У наступнай сустрэчы, меўшай месца ў тым-жа верасні ў памяшканні інстытута, КАТАЛЫНАЎ загаварыў аб тэроры. КАТАЛЫНАЎ запытаў мяне, ці гатоў я на правядзенне тэрарыстычнага акта над КІРАВЫМ. Я адказаў, «што гатоў узяць на сябе непасрэднае выкананне акта...» (том 2-гі, ліст справы 81).

Удакладняючы змест гэтай гутаркі, НІКАЛАЕЎ Л. В. паказаў, што іменна тады ім і КАТАЛЫНАВЫМ былі распрацаваны магчымыя варыянты замаху, прычым было вырашана, што:

«Прыдзецца дзейнічаць у залежнасці ад абставін, якая павінна будзе падказаць, які з абмеркаваных варыянтаў нападу павінен быць прынятым...» (том 2-гі, ліст справы 82).

Пры гэтым, згодна паказанняў НІКАЛАЕВА Л. В., КАТАЛЫНАЎ сказаў, што

«устраненнем КІРАВА вслабіць існуючая кіраўніцтва ВКП(б), што з КІРАВЫМ у быўшай апазіцыі ёсць свае асабыя рахункі ў сувязі з той барацьбой, якую ён арганізаваў супроць ленінградскіх апазіцыянераў»... (том другі, ліст справы 81).

У далейшым НІКАЛАЕЎ Л. сам прызнаў, што абвінавачаны КАТАЛЫНАЎ прыняў непасрэдны ўдзел і ў распрацоўцы плана замаху на жыццё таварыша КІРАВА.

Гэты план, датаваны 1 лістапада г. г., знойдзены пры НІКАЛАЕВЕ пры яго затрыманні і дапучаны да справы ў якасці аднаго з рэчавых доказаў, быў распрацаван да найдрабнейшых падрабязнасцей, прадугледжваючы нават затрудненні і перашкоды, якія могуць сустрэцца на шляху яго выканання.

Гаворачы аб ролі ў падрыхтоўцы к забойству тав. КІРАВА сваіх суўдзельнікаў, абвінавачаны НІКАЛАЕЎ паказаў:

«...КАТАЛЫНАЎ прапрацаваў непасрэдна са мною тэхніку правядзення акта, ухваліў гэту тэхніку, спецыяльна высвятліў, наколькі метка я страляю. Ён з'яўляўся непасрэдным маім кіраўніком па ажыццяўленню акта.

СОКАЛАЎ высвятляў, наколькі зручным з'яўляецца той ці іншы пункт звычайнага маршрута КІРАВА, аблягчаючы тым самым маю работу. СОКАЛАЎ высвятляў маршруты КІРАВА перад Окцябрскімі ўрачыстасцямі 1934 г.

ЮСКІН быў асведамлен аб падрыхтоўцы акта над КІРАВЫМ: ён прапрацоўваў са мною варыянт замаху ў Смольным.

ЗВЕЗДОЎ і АНТОНАЎ ведалі аб падрыхтоўцы акта... яны былі звязаны непасрэдна з КАТАЛЫНАВЫМ, ад якога я ведаю, што яны былі скарыстаны, збіраючы інфармацыю па Смольнаму» (том першы, ліст справы 274).

Следства ўстанавіла, што НІКАЛАЕЎ Л., у рэзультаце прынятага контррэволюцыйнай падпольнай тэрарыстычнай групай рашэння забіць тав. С. М. КІРАВА, на працягу доўгага часу вёў сумесна са сваімі суўдзельнікамі старанную падрыхтоўку к правядзенню гэтага гнуснага злачынства.

Так, абвінавачаны НІКАЛАЕЎ Л. на працягу некалькіх месяцаў (жнівень-лістапад 1934 года) «абстрэльваў», як ён сам выразіўся, меўшыся ў яго распараджэнні прызначаны для правядзення забойства тав. КІРАВА рэвальвер сістэмы «наган», сістэматычна практыкуючыся ў меткасці стрэльбы. Адначасова абвінавачаны НІКАЛАЕЎ Л. прымаў меры к пераходу на нелегальнае становішча, у сувязі з чым зігатовіў бланкі з штэмпелямі розных дзяржаўных устаноў. Тут-жа трэба адзначыць, што ў мэтах ўтойвання слядоў злачынства і сваіх суўдзельнікаў, а таксама ў мэтах маскіроўкі сапраўдных матываў забойства тав. КІРАВА, абвінавачаны НІКАЛАЕЎ Л. загатовіў рад дакументаў (дзенік, заявы ў адрасы розных устаноў і т. п.), у якіх стараўся паказаць сваё злачынства, як акт асабістага адчаю і нездаволенасці ў сілу нібыта цяжкага свайго матэрыяльнага становішча і як пратэст супроць «несправядлівых адносін да жывога чалавека з боку аддзельных дзяржаўных асоб»

Абвінавачаны НІКАЛАЕЎ Л. сам прызнаў іншывасць і вымушанасць падобнага роду версіі, вытлумачыўшы, што гэту версію ён стварыў па папярэдняй згодзе з членамі тэрарыстычнай групы, рашыўшай прадставіць забойства тав. КІРАВА, як індывідуальны акт і тым самым скаваць сапраўдныя матывы гэтага злачынства. (том першы, ліст справы 6).

У паказаннях ад 13 снежня г. г. НІКАЛАЕЎ Л. так прама і гаворыць:

«... Я павінен быў прадставіць забойства КІРАВА, як індывідуальны акт, каб утаіць удзел у ім зіноўеўскай групы». (том 1-шы, ліст справы 266).

Гэта акалічнасць знаходзіць сваё пацвярджэнне таксама і ў тым, што, як гэта вычэрпваючым чынам устаноўлена ў працэсе расследвання, абвінавачваемы НІКАЛАЕЎ Л. рашуча і сістэматычна адхіляў усякія прапановы аб яго ўладжванні на работу, спасылаючыся то на слабы стан свайго здароўя і неабходнасць пячыцца, то на якія-небудзь іншыя акалічнасці, перашкаджаючыя нібы яго паступленню на службу.

Паказаннямі дапытаных па гэтай справе ў якасці сведак раду асоб, у тым ліку маткі абвінавачанага НІКАЛАЕВА Л. — М. Т. НІКАЛАЕВАЙ і яго жонкі — ДРАЎЛЕ Мільды, следства ўстанавіла, што абвінавачаны Нікалаеў матэрыяльных нястач у гэты перыяд часу не цярпеў, як не цярпела нястач і яго сям'я. Аб адсутнасці ў абвінавачанага НІКАЛАЕВА Л. у гэты перыяд часу якіх-небудзь матэрыяльных затрудненняў гаворыць таксама і тая акалічнасць, што НІКАЛАЕЎ займаў добра абстаўленую кватэру з трох пакояў і, апрача таго, летам 1934 года знімаў на Сестрарэцкім курорце ў прыватнага домаўласніка дачу. Аб матэрыяльным становішчы абвінавачанага НІКАЛАЕВА Л. і яго сродках да існавання можна меркаваць па ўжо прыведзенаму вышэй яго ўласнаму паказанню аб атрыманні ім значных грашовых сум ад..... консул.....

У адным са сваіх паказанняў абвінавачаны НІКАЛАЕЎ прама заяўляе:

«Я паставіў яго (КАТАЛЫНАВА) у ведама, што рашыў не паступаць на работу ў перыяд падрыхтоўкі акта, каб мець дастатковую колькасць вольнага для ажыццяўлення забойства КІРАВА часу. КАТАЛЫНАЎ ухваліў маё рашэнне» (том 2-гі, ліст справы 85).

Тое-ж самае пацвярджае жонка абвінавачанага Л. НІКАЛАЕВА — МІЛЬДА ДРАУЛЕ, якая паказвае:

«... З канца сакавіка 1934 года аж да яго (г. зн. НІКАЛАЕВА Л.) арышту ён нідзе не працаваў. Гэта тлумачылася не тым, што НІКАЛАЕЎ не мог атрымаць работу, а яго ўпартым нежаданнем заняцца якой-небудзь работай. Аддаўшы сябе цалкам падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта, я мяркую, што ён не хацеў звязваць сябе работай дзе-небудзь»... (том 3-ці, ліст справы 201).

ФОРМУЛА АБВІНАВАЧАННЯ

Аналізуючы вышэйвыпажанае, следства лічыць устаноўленым:

1) што ў перыяд 1933-34 г. г. у г. Ленінградзе з ліку былых удзельнікаў зіноўеўскай антысавецкай групы арганізавалася і дзейнічала падпольная контррэволюцыйная тэрарыстычная група, паставіўшая сваёй мэтай дэзарганізаваць кіраўніцтва совецкага ўрада шляхам тэрарыстычных актаў, накіраваных супроць кіраўнікоў совецкай улады, і змяніць такім спосабам цяперашнюю палітыку ў духу так званай зіноўеўска-трацкісцкай платформы;

2) што ў склад гэтай падпольнай контррэволюцыйнай тэрарыстычнай групы ўваходзілі абвінавачаныя па гэтай справе: НІКАЛАЕЎ Л. В., КАТАЛЫНАЎ І. І., МЯСНІКОЎ Н. П., ШАТСКІ Н. М., МАНДЭЛЬШТАМ С. О., СОКАЛАЎ Г. В., ЗВЕЗДОЎ В. І., ЮСКІН І. Г., РУМЯНЦЭЎ В. В., АНТОНАЎ Н. С., ХАНІК А. О., ТОЛМАЗАЎ А. К., ЛЕВІН В. С., і САСІЦКІ Л. М.;

3) што гэтай падпольнай контррэволюцыйнай групай кіраваў нелегальны тэрарыстычны «ленінградскі цэнтр», у складзе абвінавачаных: КАТАЛЫНАВА І. І., ШАТСКАГА Н. Н., РУМЯНЦЭВА В. В., МАНДЭЛЬШТАМА С. О., МЯСНІКОВА Н. П., ЛЕВІНА В. С., САСІЦКАГА Л. І. і НІКАЛАЕВА Л.;

4) што контррэволюцыйны тэрарыстычны «ленінградскі цэнтр», зыходзячы са сваіх указаных вышэй злачынных мэт, а таксама кіруючыся матывам помсты ў адносінах члена прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР, члена палітбюро ЦК ВКП(б) і сакратара ЦК і ЛК ВКП(б) тав. С. М. КІРАВА, разбіўшага ідэйна і палітычна ленінградскую групу былых зіноўеўцаў, распрацаваў план і арганізаваў забойства т. С. М. КІРАВА, якое і было першага снежня г. г. зроблена НІКАЛАЕВЫМ Л. В.

Прыцягнутыя ў якасці абвінавачаных па данай справе, па сутнасці прад'яўленага ім абвінавачання паказалі:

1) НІКАЛАЕЎ Л. — вінаватым сябе поўнасцю прызнаў і даў паказанні, прыведзеныя вышэй;

2) КАТАЛЫНАЎ — прызнаў сябе вінаватым у прыналежнасці да падпольнай тэрарыстычнай групы, адмаўляючы свой непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы НІКАЛАЕВЫМ забойства тав. КІРАВА;

5) ЗВЕЗДОЎ — поўнасцю прызнаў сябе вінаватым;

6) ЮСКІН — адмаўляючы сваю прыналежнасць да ўказанай вышэй групы, прызнаў, аднак, што ведаў аб падрыхтоўваемым забойстве тав. КІРАВА;

7) АНТОНАЎ — прызнаў сябе вінаватым поўнасцю;

8) РУМЯНЦЭЎ — прызнаў сябе вінаватым толькі ў прыналежнасці да падпольнай групы былых зіноўеўцаў;

9) МАНДЭЛЬШТАМ — прызнаў сябе вінаватым як у прыналежнасці да ўказанай групы, так і ў тым, што з'яўляўся членам «ленінградскага цэнтра», адмаўляючы, аднак, сваю асведамленасць аб тэрарыстычных мэтадах дзейнасці гэтай групы;

10) ТОЛМАЗАЎ — прызнаў сябе вінаватым у прыналежнасці да ўказанай вышэй групы;

11) ЛЕВІН — прызнаў сябе вінаватым у тым, што быў адным з кіраўнікоў ленінградскай падпольнай групы былых зіноўеўцаў;

12) ХАНІК і

13) МЯСНІКОЎ — прызналі сябе вінаватымі толькі ў прыналежнасці да падпольнай групы былых зіноўеўцаў;

14) САСІЦКІ — прызнаў сябе вінаватым у прыналежнасці да «ленінградскага цэнтра» і ў тым, што яму былі вядомы тэрарыстычныя настроі членаў падпольнай антысовецкай групы былых зіноўеўцаў.

На падставе ўсяго сказанага абвінавачваюцца:

1) НІКАЛАЕЎ Леанід Васільевіч, 1904 г. нараджэння, служачы, былы член партыі, які выключаўся з партыі за парушэнне партыйнай дысцыпліны, але адноўлены з прычыны яго заявы аб раскаянні, — у тым, што, з'яўляючыся членам тэрарыстычнай падпольнай контррэволюцыйнай групы, якая стварылася з ліку ўдзельнікаў былушай зіноўеўскай антысовецкай групы ў г. Ленінградзе, і членам падпольнага контррэволюцыйнага тэрарыстычнага «ленінградскага цэнтра», па даручэнню апошняга зрабіў першага снежня 1934 года ў г. Ленінградзе ў будынку Смольнага забойства члена прэзідыума ЦВК СССР, члена палітбюро ЦК ВКП(б) і сакратара ЦК і ЛК ВКП(б) таварыша С. М. КІРАВА, г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-8 і 58-11 К.К. РСФСР;

2) КАТАЛЫНАЎ Іван Іванавіч, 1905 года нараджэння, студэнт, былы член ВКП(б), які выключаўся з партыі за прыналежнасць да зіноўеўскай антысовецкай групы, але адноўлены пасля яго афіцыяльнай заявы поўнай салідарнасці з палітыкай партыі і совецкай улады;

3) ШАТСКІ Нікалай Нікалаевіч, 1899 года нараджэння, інжынер, выключаны ў 1927 годзе з радоў ВКП(б) за прыналежнасць да зіноўеўскай антысовецкай групы, беспартыйны;

4) РУМЯНЦЭЎ Владзімір Васільевіч, 1902 года нараджэння, служачы, былы член ВКП(б), які выключаўся з партыі за прыналежнасць да зіноўеўскай антысовецкай групы, але адноўлены пасля яго афіцыяльнай заявы аб поўнай салідарнасці з палітыкай партыі і совецкай улады;

5) МАНДЭЛЬШТАМ Сергей Осіпавіч, 1896 года нараджэння, служачы, былы член партыі, які выключаўся з партыі за прыналежнасць да зіноўеўскай антысовецкай групы, але адноўлены па тых-жа матывах;

6) МЯСНІКОЎ Нікалай Петровіч, 1900 года нараджэння, служачы, які два разы выключаўся з партыі за прыналежнасць да зіноўеўскай антысовецкай групы, але адноўлены па тых-жа матывах;

7) ЛЕВІН Владзімір Саламонавіч, 1897 года нараджэння, служачы, былы член ВКП(б), які выключаўся з партыі за прыналежнасць да зіноўеўскай антысовецкай групы, але адноўлены па тых-жа матывах;

8) САСІЦКІ Леў Ільіч, 1899 года нараджэння, служачы, былы член партыі, які выключаўся за прыналежнасць да зіноўеўскай антысовецкай групы, але адноўлены па тых-жа матывах;

9) СОКАЛАЎ Георгі Васільевіч, 1904 года нараджэння, студэнт, былы член ВКП(б);

10) ЮСКІН Ігнаці Грыгор'евіч, 1898 года нараджэння, служачы, былы член ВКП(б);

11) ЗВЕЗДОЎ Васіль Іванавіч, 1902 года нараджэння, студэнт, былы член ВКП(б);

12) АНТОНАЎ Нікалай Семёнавіч, 1903 года нараджэння, студэнт, былы член ВКП(б);

13) ХАНІК Леў Осіпавіч, 1902 года нараджэння, служачы, былы член ВКП(б);

14) ТОЛМАЗАЎ Андрэй Ільіч, 1899 года нараджэння, студэнт, былы член ВКП(б);

Усе ў тым, што будучы ўдзельнікамі падпольнай контррэволюцыйнай тэрарыстычнай групы ў г. Ленінградзе, арганізавалі і падрыхтавалі зроблене абвінавачаным НІКАЛАЕВЫМ 1-га снежня 1934 года забойства т. С. М. КІРАВА, г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-8 і 58-11 К.К. РСФСР.

З прычыны ўсяго сказанага і ў адпаведнасці з пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР ад 19-га ліпеня і 1-га снежня 1934 г. усе ўказаныя вышэй асобы падлягаюць суду ваенней калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР.

Данае абвінаваўчае заключэнне склад

За рубяжом

ПАДРЫХТОУКА ДА УСЕАГУЛЬНАЙ ВАЙСКОВАЙ ПАВІННАСЦІ У ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 25 снежня. (БЕЛТА). Ваенны міністр Бломберг даў учора інтэрв'ю карэспандэнту амерыканскага тэлеграфнага агенцтва «Асашыэйтэд прэс».

Бломберг ухіліўся ад адказу на пэўнае пытанне карэспандэнта — «якое становішча германскіх узбраенняў», заявіўшы, што ён не ўпаўнаважан давать тлумачэнні па пытаннях «чыста палітычнага характару». На пытанне аб становішчы штурмавых і ахоўных атрадаў Бломберг адказаў: «Пасля падзей 30 чэрвеня ітэ у салдаты ў штурмавых атрадах спынілася. Ёсць пэўны загад Гітлера, што рэйхсвэр і чэрнь'ё ён адзін, павінен быць носьбітам узброенай сілы нацыі». Далей Бломберг недвузначна пацвердзіў паведамленні, распаўсюджаныя заграніцай чуткі аб падрыхтоўцы да ўвядзення ў Германіі ўсеагульнай вайсковай павіннасці, дадаўшы: «Калі я выказаўся за ўсеагульную вайсковую павіннасць, то не таму, што я супраць прафесіянальнай арміі». На думку Бломберга, увядзенне ўсеагульнай вайсковай павіннасці імкнецца сведчыць аб «мірных намерах Германіі», бо, паводле яго слоў, невялікая армія добра абучаных і ўзброеных прафесіянальных салдат больш прыстасавана да вайны, чым армія кароткатэрміновай службы. Сапраўднае ўвядзенне вайсковай павіннасці ў тым, што «армія—вышэйшая школа для выхавання характару».

— Дазвольце,—запытаўся карэспандэнт, — а штурмавыя атрады, ахоўныя атрады і лагеры працоўнай павіннасці, гэта хіба не школа для выхавання характару?

«Безумоўна,—адказаў міністр, — яны імі і з'яўляюцца. Гэтыя тры арганізацыі ствараюць натуральна, галоўны рэзервуар, з якога будзе папаўняцца ўзброеная сіла».

„ФІНЛЯНДЫЯ У ГЕРМАНА-ЯПОНСКАЙ ІГРЫ"

КАЎНАС. (КОВНА). 25 снежня. (БЕЛТА). «Остзее бэабэхтэр», якая выходзіць у Мемелі, змяшчае паведамленне з Гельсінфорса пад загалоўкам «Фінляндыя ў германа-японскай ігры». У гэтай заметцы гаворыцца, што Фінляндыя ў апошні час узмоцнена узброіваецца. Апрача двух знішчальнікаў, якія знаходзяцца ў сучасны момант на пабудове, Фінляндыя заказала англійскім верфям яшчэ 17 знішчальнікаў.

У гэтай сувязі газета напамінае аб вышэйшай нядаўна ў вялікім тыражы ў Фінляндыі кнізе Раутэкура пад назвай «Барацьба за суверэнтэт», пазначае наступныя факты, якія сведчаць аб наяўнасці гэтых хістанняў: запытанне ў сойме фракцыі эндэкаў аб знешняй палітыцы, магчымы зваот у армію генерала Сікорскага — кіраўніка прыхільніка цесная фракцыя-польскага саюза,—а таксама арыкул у «Кур'еры варшаўскім», у якім бяроціца пад рэзкую крытыку знешнепалітычная лінія Бека.

«Ордэр» бачыць прычыны непакою частка польскай грамадскай думкі цяперашнім курсам знешняй палітыкі ў тым, што лінія Бека праваліла на ўсіх пунктах. Бек, на думку «Ордэр», не здолеў раскалоць краіны Малой Антанты і не здолеў перашкодзіць стварэнню блока балтыйскіх краін, да чаго ён усімі спосабамі імкнуўся. Больш таго, баланс польска-германскага зблізкання выгадны для Германіі і яўна адмоўны для Польшчы. Германія здолела за апошні час скарыстаць Польшчу, як зброю сваёй знешняй палітыкі. Даволі ўспомніць паводзіны Польшчы ў адносінах усходняга пакта і вешнера-гласлаўскага канфлікта, яе ўступкі ў адносінах Данцыга і т. д. Наадварот, Германія не пайшла ні на якія ўступкі і, як гэта даказвае заява Нейрата рымскай газеце «Месаджэро», не адмовілася ад сваёй рэвізіяністкай праграмы на Ўсходзе, у прыватнасці, у адносінах Данцыгскага карыдора і Сілезіі. — Знешняя палітычная лінія Германіі ў сувязі з адпаданнем ў першыя 1935-1950 г.г. У гэтай кнізе аўтар падрабязна рысуе карціну завалявання савецкай Сібіры Японіяй. Аўтар рысуе карціну аб'яўлення Японіяй вайны Савецкаму Саюзу, якая павінна з'явіць па сігналам да нападу фінляндскай арміі на савецкую Карэлію.

У тым-жа паведамленні «Остзее бэабэхтэр» гаворыцца, што паміж генеральнымі штабамі Фінляндыі і Германіі існуе «асабліва цесная дружба», заметны таксама сувязі з генштабам Фінляндыі і японскіх агентаў, наведаўшых нядаўна скандынаўскія краіны.

Французскі друк аб незадаваленні польскіх грамадскіх колаў палітыкай свайго ўрада

ПАРЫЖ, 25 снежня. (БЕЛТА). Французскі друк з цікавасцю сочыць за некаторымі адзнакамі незадаволення ў польскіх грамадскіх колах знешняй палітыкай польскага ўрада. «Тан» у перадавым адзначае наступныя факты, якія сведчаць аб наяўнасці гэтых хістанняў: запытанне ў сойме фракцыі эндэкаў аб знешняй палітыцы, магчымы зваот у армію генерала Сікорскага — кіраўніка прыхільніка цеснага фракцыя-польскага саюза,—а таксама арыкул у «Кур'еры варшаўскім», у якім бяроціца пад рэзкую крытыку знешнепалітычная лінія Бека.

«Ордэр» бачыць прычыны непакою частка польскай грамадскай думкі цяперашнім курсам знешняй палітыкі ў тым, што лінія Бека праваліла на ўсіх пунктах. Бек, на думку «Ордэр», не здолеў раскалоць краіны Малой Антанты і не здолеў перашкодзіць стварэнню блока балтыйскіх краін, да чаго ён усімі спосабамі імкнуўся. Больш таго, баланс польска-германскага зблізкання выгадны для Германіі і яўна адмоўны для Польшчы. Германія здолела за апошні час скарыстаць Польшчу, як зброю сваёй знешняй палітыкі. Даволі ўспомніць паводзіны Польшчы ў адносінах усходняга пакта і вешнера-гласлаўскага канфлікта, яе ўступкі ў адносінах Данцыга і т. д. Наадварот, Германія не пайшла ні на якія ўступкі і, як гэта даказвае заява Нейрата рымскай газеце «Месаджэро», не адмовілася ад сваёй рэвізіяністкай праграмы на Ўсходзе, у прыватнасці, у адносінах Данцыгскага карыдора і Сілезіі. — Знешняя палітычная лінія Германіі ў сувязі з ад-

СУД НАД КУЛАЦКІМІ ЧУБАРАЎЦАМІ У ПУХАВІЦКІМ КАЛГАСЕ „СЕЧЧА"

21-22 снежня ў калгасе «Сечча» адбыўся паказальны судовы працэс над кулацкімі чубараўцамі (гл. «Звязду» ад 15 лістапада). Справу разглядала выязная сесія Вярхоўнага суда БССР у складзе старшыні т. Безбарда, народных засядацеляў т. т. Жур і Раманенка з удзелам пракурора тав. Калачова.

Памяшканне, дзе адбываўся працэс, перапоўнена.

На лаве падсудных арганізатары чубараўшчыны — А. Працкевіч, Рыгор Бялько, а таксама былы афіцэр Максім Зязюльчык і Лявон Жук. На судзе выкрываецца ўся кулацкая дзейнасць рахункавода Зязюльчыка, Зязюльчык і Працкевіч — адна радня, адна «хаўра». Яны нямала правялі шкодных работы, накіраванай на падрыў калгаса.

Апошні падсудны, — старшыня Дрычанскага сельсавета Жук. Два тыдні назад Жук быў асуджан на год прымусовых работ за бесгаспадарчасць у калгасе імя Егорава, старшынёй якога ён быў раней. Зараз ён абвінавачваецца ў марнаванні заявы Лиды Шыманец. Таксама выкрываецца яго сувязь з Працкевічам і Зязюльчыкам, якім ён патураў усімі спосабамі. Жук браў з калгаса без ніякіх гропай калгасную бульбу, п'янстваваў разам з чубараўцамі.

Суд дастойна пакараў кулацкіх чубараўцаў.

Антон Працкевіч на падставе 22-235а, 196-1 і 204-а арт. КК **прыгаворан** да пазбаўлення волі ў аддалёных мясцовасцях заняволення тэрмінам на 6 год.

Рыгор Бялько прыгаворан на падставе 235-а арт. КК да пазбаўлення волі ў аддалёных мясцовасцях заняволення тэрмінам на 5 год.

Максім Зязюльчык на падставе 107-а і 196 арт. КК прыгаворан да пазбаўлення волі ў аддалёных мясцовасцях тэрмінам на 3 гады.

Лявон Жук на падставе 196 арт. КК прыгаворан да 6 месяцаў прымусовых работ.

Прыгавор канчатковы і абскарджанню не падлягае.

***

Пасля выкрыцця «Звяздой» кулацкіх чубараўцаў у калгасе «Сечча» прайшло каля паўтары месяцы. За гэты час Пухавіцкі РК КП(б)Б і палітаддзел МТС прынялі рад пастаноў аб аздараўленні калгаса. Месяц таму назад бюро ЦК КП(б)Б прыняло спецыяльную пастанову на гэтай справе, даўшы вычарпальную палітычную ацэнку фактам, якія мелі месца ў калгасе «Сечча».

Раённыя арганізацыі абавязаны былі выканаць пастанову ЦК. Аднак, на самой справе становішча ў калгасе яшчэ далёка неадпавядае. На працягу месяца ў калгасе фактычна не было старшыні. Толькі 10 дзён назад прыслан новы старшыня комуніст тав. Шашкоў.

У калгасе па-ранейшаму дзейнічае класавы вораг. На пасаду рахункавода прышоў антысавецкі элемент, нехта Мотус Кузьма. Клаўшчыком калгаса астаўся брат Бялько Рыгора — Алесь Бялько. У праўленні калгаса астаўся Сяргей Зязюльчык—сваяк Максіма Зязюльчыка. Рэвізійнай камісіі ў калгасе яшчэ няма.

Раённыя арганізацыі па-ранейшаму мала звяртаюць увагі на калгас «Сечча». На працягу апошняга часу нікога з палітаддзела і РК не было. Нават у часе судовага працэса прадстаўніка з РК і палітаддзела не было.

Апрача таго, РК КП(б)Б не прыняў своечасовых мер да аздараўлення кіраўніцтва Дрычанскага сельсавета. Па-ранейшаму Жук астаўся на пасадзе старшыні сельсавета. Зараз і ён адбывае прымусовую работу «на месцы працы».

А. ЛОСЬ.

ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ ПЕРАД НОВЫМІ ЗАДАЧАМІ

(Да нарады па грамадскаму харчаванню БССР 26 снежня ў Менску)

Навыкі разморжавальніцтва ў рабоце сістэмы грамадскага харчавання моцна ўкараніліся. Па ўсёй БССР адкрытых магазінаў вельмі мала: па Менску — 3, Віцебску — 6, Гомелю — 6 і т. д.

У радзе прадпрыемстваў грамадскага харчавання па гарадах і раёнах ёсць убытачнасць, растраты і раскрадванні. Гэта сведчыць аб недастатковым укараненні гаспадарчага разрахунку на прадпрыемствах, засмечанасці нашых многіх сталовых класава-чужымі элементамі і рознага роду жулікамі. Няма неабходнай пільнасці ў падборы кадраў грамадскага харчавання.

Асноўнай задачай сённяшняга дня па паляпшэнню грамадскага харчавання з'яўляецца максімальнае развіццё адкрытай сеткі па гарадах і буйных раёнах БССР, адкрыццё агульнадаступных сталовых, кафейных і закусачных. Неабходна ў тэрміновым парадку перагледзець і праверыць у бой жорсткага скарачання накладныя выдаткі, наладзіць эканомнае расходаванне прадуктаў і ўстанавіць больш шырокі асартымент блюд і пастаянны сістематычны кантроль над работай сталовых.

Пытанні развіцця свінаадкорму і дэцэнтралізаваных загатовак зараз значна аблягчаюцца ў сувязі з адкрыццём разгорнутага гандлю хлебапрадуктамі. Гэтыя ўмовы павінны быць улічаны і быстра скарыстаны работнікамі грамадскага харчавання для развіцця дэзагатовак сельгапрадуктаў (гародніны, мяса, тлушчаў, птушак і т. д.).

Прадпрыемствы грамадскага харчавання павінны развіць уласную вытвараўку каўбасных вырабаў, выпечку піражкоў, пірожных і інш. вырабаў.

Мы маем зараз усе магчымасці даць спажыўцу самы шырокі асартымент меню па даступнай цане, добра і смачна прыгатаванае блюда і падаванае ў культурнай і ўтульнай абстаноўцы. Трэба пачаць практыкаваць сістэму прыгатавання і водпуску на дом сямейных абедаў па заказу—памесячна.

Сістэма грамадскага харчавання БССР зараз абагачаецца буйнейшым механізаваным прадпрыемствам—пускаецца ў бліжэйшыя дні ў эксплаатацыю менская фабрыка-кухня, якая павінна паказаць шырокі ўзорнай пастаноўкі работы па грамадскаму харчаванню.

Работнікі грамадскага харчавання павінны вывесці свае прадпрыемствы на шырокі шлях разгорнутага культурнага абслугоўвання спажыўца.

С. КАНТОР.

ГАДАВЫ ПЛАН ТАВАРАЗВАРОТУ ПЕРАВЫКАНАЎ

Менскі райспажыўсаюз 25 снежня выканаў план таваразвароту IV квартала на 100,9 проц., а гадавы план на 109,4 проц. План мабілізацыі ўраджаю IV квартала выкананы на 125 проц. і гадавы на 100,4 проц.

План закупкі ільносемя выкананы на 125,5 проц., ільнавалакна — 102 проц.

НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІР-ЧЭМПІЯНАЦЕ СССР У ЛЕНІНГРАДЗЕ

У пятнаццатым туры выйгралі: Кан у Савіцкага, Рабіновіч у Белавенца, Верасаў у Левінфіша, Макагонаў у Дубініна, Ільін-Жэнеўскі ў Разэра. Закончыліся партыі ўнічыю: Багатырчук—Юдовіч, Мазель—Алатарцаў і Румін—Чэховер.

Становішча пасля 15 тура: **Багатырчук** — 10 з 15, **Чэховер** — 9,5 з 15, **Алатарцаў і Макагонаў** — па 8 з 13, **Румін** — 8,5 з 15, **Левінфіш і Рабіновіч** — па 8 з 14, **Белавенец** — 8,5 з 15, **Верасаў** — 8 з 15, **Мазель і Юдовіч** — па 7,5 з 14 і **Кан** — 7 з 12.

Асталося іграць 4 туры.

МЕНСКІ РАЁННЫ З'ЕЗД СОВЕТАЎ

На ранішнім пасяджанні з'езда з дакладам аб рабоце РВК і далейшых задачах выступіў старшыня сэкбюро РВК тав. **Жарын.**

У сваім дакладзе тав. Жарын падрабязна спыняўся на тых поспехах, з якімі Менскі раён сустрэў свой першы з'езд.

— Тое, што наш раён заняў адно з першых месц сярод раёнаў Беларусі і Савецкага Саюза, гаворыць тав. Жарын, і за што залесен «Правдой» на ўсесаюзную чырвоную дошку і атрымаў пераходны чырвоны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК абазначае нас не самаадпакойваецца, а, наадварот, з большэвіцкай напорыстасцю змагацца з тымі недахопамі, якія сустракаюцца ў нашай рабоце.

— Наша задача—змагацца за больш'евіцкія калгасы, за сапраўдна заможнае і культурнае калгаснае жыццё, за захаванне маладняка і жабліва конскага паголоўя, з тым, каб 1935 год стаў рэкордным годам у сэнсе ўзняцця ўраджайнасці і жывёлагадоўлі.

Па дакладу тав. Жарына разгарнуліся гарачыя спрэчкі, у якіх выказалася 15 чалавек.

Калгаснік калгаса «Чырвоны агароднік», Прытаральнага сельсавета тав. Жур в гонарам расказвае з'езду аб тым, наколькі ў гэтым годзе ў парэйшчыны з мінулым урасцы вага калгаснага прадпрыемства.

— Мы раней атрымлівалі мала, гаворыць яна, таму што нашу работу падрывалі кулакі. Мы іх вычысцілі з калгаса. Цяпер наш працадзень важыць 15 кілограмаў агародніны, 9 кілограмаў бульбы, і кілограм зерневых і 4 руб. 50 кап. грашыма.

Са значнымі поспехамі прышоў да з'езда калгас імя Сталіна (Кажкаўскі сельсавет). Аб гэтым расказвае старшыня калгаса тав. **Гыгарцэвіч.**

— Ураджай 12 цэнтнераў зерневых і 120 цэнтнераў бульбы з га недастатковы і мы дабіўся большай ураджайнасці ў 1935 годзе. Не гледзячы на тое, што ў мінулым калгас быў у глыбокім прарыве, усё-ж на працадзень калгаснікі атрымлівалі 3½ кілограма зерневых, 10 кілограмаў бульбы, 1 кілограм гародніны і 40 кап. грашыма.

Усе выступаўшыя асабліва спыняліся на жывёлагадоўлі, як на адным з слабых участкаў работы, падкрэсліваючы неабходнасць барацьбы за добры догляд і захаванне конскага паголоўя, барацьбы з абартаваннем конематак, якое стала ў раёне масавай з'явай.

Раніцяе пасяджэнне з'езда закончылася выступленнем прадстаўніка Н-скай дывізіі тав. **Кавяўскага.**

***

На вечарнім пасяджэнні працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Жарына. Выступілі тт. **Каўшовіч, Шэпет, Курыпоўскі, Валодзька, Дамарацкі, Бабурка, Плітава, Валтрушыц, Велігруцкі і інш., усяго 23 чал.**

З'езд віталі трактарысты МТС, члены перадавой асаавіяхімаўскай арганізацыі калгаса імя Фалько, калгаснікі Прытаральнага сельсавета і спецыялісты раёна.

Сёння—даклад аб культурным будаўніцтве.

Святкаванне юбілея М. Ф. Рафальскага

23 снежня ў памяшканні Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 25-гадоваму юбілею тэатральнай дзейнасці народнага артыста рэспублікі **М. Рафальскага.**

На святкаванне юбілея прыбыла дэлегацыя маскоўскіх тэатраў на чале з драматургам **А. Глебавым,** ад яўрэйскіх савецкіх пісьменнікаў і драматургаў Масквы тав. **Кушнероў,** ад Наркомасветы і яўрэйскіх савецкіх пісьменнікаў Украіны тав. **Даніэль,** ад Маскоўскага мастацкага тэатра і **Норд** і інш.

З дакладам аб творчасці М. Ф. Рафальскага выступіў дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва Акадэміі навук тав. **Вольскі.**

На сходзе былі зачытаны атрыманыя прывітальныя тэлеграмы ад міжнароднага аб'яднання рэвалюцыйных тэатраў, Малога тэатра, МХАТ-2, тэатра імя Вахтангава, ленінградскіх тэатраў, ад народнага артыста рэспублікі **Неміровіча Данчэнка,** ад заслужанага артыста **Міхоэльса,** ад народнага артыста **Я. Купалы** і інш. Усяго ў адрас юбілейнага камітэта паступіла каля 300 прывітальных тэлеграм з розных рэспублік Савецкага Саюза і з-за мяжы.

Юбіляра на ўрачыстым пасяджэнні вітала дэлегацыя ад рабочых горада Менска, прадстаўнікі тэатраў БССР, Белдзяржкіно, Наркомасветы БССР, пісьменнікаў, кампазітараў і інш.

Урачыстым сходам пасланы прывітальныя тэлеграмы тав. **Сталіну, тт. Гікалу і Галадзеду.**

Урачыстае пасяджэнне закончылася вялікім канцэртам.

Адказны рэдактар **Н. ЛЕНЦНЕР.**

ПАПРАЎКА

У 6 абзацы пастановы Прэзідыума праўлення Белкаапсаюза ад 22 снежня 1934 г. «Аб мерапрыемствах па арганізацыі гандлю хлебам», змешчанай у «Звязде» ад 26 снежня 1934 года, надрукавана: «Адмяніць у першыя дні студзеня выхадныя дні прадаўцам і касірам, узгадніўшы гэта пытанне з прафарганізацыямі».

ТРЭБА ЧЫТАЦЬ:

«Перанесці ў першыя дні студзеня выхадныя дні прадаўцам і касірам на іншыя дні, узгадніўшы гэта пытанне з прафарганізацыямі».

Старшыня Прэзідыума праўлення Белкаапсаюза **БАСКІН**

Рэпертуар Бел. дзярж. тэатра Оперы і Балета

Бел. 24505 Мастацкі кіраўнік засл. артыст рэсп. І. А. ГІТГАРЦ

Апошні адкрыты спектакль Сёння опера—ВУФ

СЕВІЛЬСКІ ЦЫРУЛЬНІК

у 3-х дзеях муз. Расіні.

Білеты ў касе тэатра і ў рабочай касе. Пач. так у 8 гадз. вечара.

Гуляны кіно-тэатр „Пролетарый" — Самая весёлая камедыя **Насяленны прынц рэспублікі**

Кіно „Кастрычніцкае" — Ад 25 снежня **Новая праграма**

Кіно „СПАРТАН" — Вечар камедыі 3 **ПРАГ АМЫ** ў адзін сеанс 3

10 студзеня 1935 г. у 8 г. вечара ў анатамічным корпусе Беларускага дзярж. ун. медыцын. інстытута, у аўдыторыі № 110 (Універсітэцкі гарадок) адбудзецца **1-ае адкрытае пасяджэнне савета медыцынскага ін-та,** на якім адбудзецца абарона **дысертацыі** на ступень **доктара медыцыны** дырэктара вочнай клінікі, **прафесара М. А. Дворжаца,** на тэму „Эксперыментальныя, клінічныя і статыстычныя даследы па пытанню аб траўматызме і захворваннях вачэй на прамысловасці".

Дырэкцыя медінстытута.

Гістфак БДУ і Інстытут гісторыі БелАН просіць усіх выкладчыкаў - гісторыкаў БССР **паскорыць прысылку запоўненых анкет,** разасланых гісторыкам-выкладчыкам.

Гістфак і Інстытут гісторыі БелАН.

ДЗЯРЖЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

Гэтымі днямі выходзяць з друку і рассылаюцца па кнігарнях ДВБ і БАКТ'а

ГОРКІ МАЦІ

Тыр. 10.000 Цана 1 руб. 50 кап. Пераплёт 25 кап.

ШОЛАХАЎ ПАДНЯТАЯ ЦАЛІНА

Выд. II., тыр. 8.000

З заказамі звяртацца ў кнігарні ДВБ і БАКТ'а.

Кнігасэнтар ДВБ.

На падставе палажэння, зацверджанага СНК БССР ад 17 чэрвеня 1934 г.

КІРАЎНІЦТВА па КАНТРОЛЮ за РЭПЕРТУАРАМ і ВІДОВІШЧАМІ пры НАРКОМАСВЕТЫ БССР

прапануе ўсім дырэктарам тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў, акрамя непасрэдна падпарадкаваных НКА БССР. заг. клубамі, рэстаранамі і кафэ, у якіх ёсць канцэртна-эстрадныя пастаноўкі,

ПРАДСТАВІЦЬ У КІРАЎНІЦТВА НАСТУЛНЫЯ ВЕСТКІ:

ПА ФОРМЕ:

1. Назва прадпрыемства,
2. Характар прадпрыемства,
3. У чым ведамі знаходзіцца,
4. Прозвішча кіраўніка прадпр.
5. Прозвішча мастацкага кіраўніка,
6. Стацыянарнае або перасовачнае
7. Склад групы або калектыва.
8. Вытворча-рэпертуарны план або праграма.
9. Дакладны адрас установы.

Тэрмін рэгістрацыя—5 студзеня 1935 г.

Весткі прадстаўляюць установы, якія знаходзяцца ў г. Менску.

Установы, не зарэгістраваныя да ўказанага тэрміну, будуць прыцягнуты да адказнасці, як парушэўшыя закон аб кантролі за рэпертуарам і відовішчамі.

Адрас кіраўніцтва: г. Менск, вул. Кірава (был. Універсітэцкая, 45, памяшк. кансерваторыі).

Прыём — з 6 дня г. вечара.

Кіраўніцтва па кантролю за рэпертуарам і відовішчамі пры НКА БССР.

Да ўвагі лячэбных устаноў, урачоў і хворых

З прычыны немагчымасці для заводаў выконваць безупынна паступаючыя ад патрабавані асобных устаноў і асоб, „ВОХИМФАРМ" просіць накіроўваць гэтыя ў спецыяльна арганізаваную для гэтай мэты пасылачную кантору ў Менску па адрасу:

Беларпэкакіраўніцтва, пасылачная кантора, Менск, БССР, Комунальная вул., д. № 1

УСЕ ніжэйуказаныя прэпараты высылаюцца канторай паштовымі пасылкамі наложным плацяжом у любых колькасцях ва ўсе пункты СССР па першаму патрабаванню.

1. АЭРОН (таблеткі супроць голаў закружэння і ташнаты ў час марской і паветранай хваробы).
2. АСТМОЛІЗІН.
3. ГІДРАСЦІЦІН (у таблетках).
4. ВЕРОНАЛ.
5. ІОДОГНОСТ.
6. ЛІЗАТЫ-КАРДЗО.
7. ЛІЗ ТЫ-ЮО. } У пробірках
8. ЛІЗАТЫ-цеста } і ампулах
9. ЛІЗАТЫ-овесью }
10. Лектан.
11. М МІН.
12. ОКСІВІРЫДОЛ (вен. профілакт. сродак).
13. ПІТ-ТЫН.
14. ГЕ ТОН у ампулах.
15. ПЕСТА ПЛАНТАГІНА.
16. САЙОДЫГІ (таблеты і порашок)
17. СПЕРМІН, (таблеты, ампулы і кроплі).
18. СПЕРМОЛІ ЕОЛ
19. СТЫПТЫЦЫН (таблеты).
20. СЕРЦАЗІН.
21. ТЫРЭОДЫН.
22. ХІПОРЫСТЫ КАЛЬЦЫЙ (у ампулах).
23. ФОЦІН (таблеты і парашок).
24. ФОЛІКУЛЕН.
25. САНГАНІН (таблеты і парашок).

Для зубаўрачавання.

26. АНТЫФЎРМІН.
27. ДЭНЦІН.
28. ГУЛАПЕРЧА.
29. СТЭНС.
30. ТРЫКРЭЗОЛ-ФАРМАЛІН.

„ВОХИМФАРМ, Москва, Кривоколенный пер., 12".

ЯШЧЭ не ПОЗНА ПАДПІСАЦЦА на 1935 ГОД

на газету

ЗВЯЗДА

Орган ЦК КПБ, ЦВК і СНК БССР.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—2 р. 50 к. на 3 м.—7 р. 50 к. на 6 м.—15 р. на 1 г.—30 р.

Падпіска прымаецца: горбюро Саюздрука, агенцтвамі сувязі і газетаносцамі да 28-га снежня.

Гуляны кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" ЗАЎТРА 23 СНЕЖНЯ **ПРЭМ'ЕРА!**

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ

МУЗЫКАЛЬНАЙ КІНО-ДЖАЗ-КАМЕДЫІ

ВЯСЁЛЫЯ РЭБЯТЫ

Рэжысёр **Г. АЛЕКСАНДРАЎ**

У галоўных ролях:

ЛЕАНІД УЦЁСАЎ

Л. ЯРЛОВА, М. СТРАЛКОВА, Ф. КУРЫХІН, Е. ПІЯПКІНА.

Штодзенна 5 сеансаў. Па ілект. звуковых білетах без чаргі. Каса адкрыта з 11 гадз. дня.

МУЗЫКАЛЬНЫ КАЛЕКТЫЎ „ДРУЖБА-ДЖАЗ АРКЕСТРА Л. УЦЁСАВА.

Цэны: Начатак: хадат. сеанс—4.50, 1 сеанс— 6 —, 2 „ — 7.50, 3 „ — 9 —, 4 „ —10.50.

Папярэдняя продажа білетаў сёння з 11 гадз. раніцы.

Да ведама ўкладчыкаў

З прычыны прылічэння процантаў па ўкладах за 1934 г.

ашчадкасы г. Менска

будуць закрыты 30 і 31 снежня.

Адзнакі па пералічэнні ўзносаў па пазыцыі будуць рабіцца ўсімі ашчадкасамі як 30-га, так і 31-га.

Менская горашчадкаса № 16.

АБ'ЯВА

Менскага гарадскога фінансавага аддзела

аб парадку і тэрмінах узяцця рэгістрацыйных пасведчанняў (патэнтаў) на 1935 год.

Менскі гарадскі фінансавы аддзел даводзіць да ведама ўсіх асоб, якія займаюцца самаатуманымі і рамесніцкімі промыслам, што яны **АБАВЯЗАНЫ не пазней 31 снежня г г. узяць рэгістрацыйныя пасведчанні (патэнты)** на заняткі самаатуманымі і рамесніцкім промыслам на 1935 год.

Заняўзяцце рэгістрацыйнага пасведчання да 31 снежня 1934 г. на вінаватых, у парадку арт. 21 палажэння аб прамысловым падатку, **будзе накладацца штраф.**

Для атрымання рэгістрацыйных пасведчанняў неабходна прадставіць марак дзяржаўнай пошліны на суму 10 руб.

Выдача рэгістрацыйных пасведчанняў праводзіцца фінансавым аддзелам (Карла Маркса, 1 горсавет, 2-гі паверх, пакой № 83).

МЕНГАРФА.

29 снежня 1934 г. ЦК МОПР'а БССР склікае ў г. Менску

АГУЛЬНА-ГАРАДСКУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ ЧЫТАЧОЎ ЖУРНАЛА „ІНТЭРНАЦЫЯЛЬНЫ МАЯК"—

орган ЦК МОПР'а СССР з удзелам прастаўніка рэдакцыі журнала тав. Герцбах.

Канферэнцыя прысвечана 10-гадоваму юбілею выхаду журнала.

Парадак дня:

1. Справаздача аб рабоце журнала „Інтэрнацыянальны маяк"—прадстаўнік рэдакцыі журнала.
2. Справаздачы бюро ячэек.

Мопраўскія ячэйкі павінны атрымаць білеты на канферэнцыю ў ЦК МОПР'а БССР.

Канферэнцыя адбудзецца ў клубе імя VII з'езда профсаюзаў (б. Саўгандальслужачых).

ЦК МОПР'а БССР.

ВЫШАЎ з ДРУКУ

і 23 снежня разаслан падпісчыкам

№ 23 ЖУРНАЛА

„БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК"

ЗМЕСТ НУМАРА:

Памяці Сергея Міронавіча КІРАВА.

Пістанадцаўскі пленум ЦК ВКП(б)

А. Джалюк.—Аб культуры газет і газетчыкаў.

Агляды друку:

Перапіска двух прыяцеляў.

І прадалі і не прадалі.

Аб кулацкіх „досвітках" і ліквідыцкіх заклінаннях.

Акт аб сілазарэзцы № 1778.

Артыкулы:

А. Цыпін.—Глыбока і ўсебакова асвятляць партыйную работу.

Л. Розенблюм,—Друк трэцяга пакалення.

С. Айзман, Я. Эстэрмін,—Аб культуры ў цэху.

Заметкі інструктара:

Юр. Бельно.—Раённая газета як яна была і як ёсць. Чытачы аб газеце „Калгаснік Талачынщчыны".

А. Меньноў.—Рэдактар газеты ці ўпаўнаважаны райкома:

Перапіска з рэдактарам:

Ян. Паўлоўскі.—Адкрытае пісьмо тав. Левіну.

Трыбуна вопыта:

А. Александраў. — Як працуе „Звязда" з пісьмамі працоўных.

М. Рабіновіч.—Завод выконвае план.

А. Матусевіч.—Калгасная, друкаваная, шматтыражная.

К. Сергіеня.—Кожную вольную гадзіну аддаю вучобе.

Вучоба рэдактара:

Аб плане і планаванні газетнай работы.

Абмяркоўваем план работы „Ударніка калгасных палёў

Наша кансультацыя:

Як арганізаваць вучобу рэдактароў нізавых газет на прадпрыемствах.

Праграма семінара для рэдактароў цэхавых і брыгадных газет.

Насустрач усебеларускаму з'езду рабселькораў:

Справа тысяч рабселькораў і чытачоў.

М. Алеміч,—Першы калгасны.

Тарасевіч.—Любімая нагрузка.

Крытычныя заметкі:

Нашы заўвагі лоеўскаму „Калгаснику".

Заметкі на палях:

Аб бюракратызацыі газетнай мовы.

Цяп-ляпіны за работай.

Шапкі і загалоўкі з каментарыямі.

У нумары 68 стар.

Журнал ілюстраваны.

Цана нумара 50 кап.

Умовы падпіскі: на год—12 р., на 6 мес.—6 руб., на 3 мес.—3 руб.

Падпіска прымаецца на пошце і ў пісьманосцаў.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Совецкая, 63.

Выпускаючы КРУЧКОЎ, ст. мэнтар — БЯРОЗАВІК ст. метрапалітэн — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. старшы ыпэр ПЕДЗІК(ст. друкар — АНУЧЫН. Тыраж 85.000 Ул. Гапоўлітбела № К—6343.

Менск, друкарня «Звязды».